ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання XV
№ 123 (4375)
ПЯТНІЦА, 3 чэрвеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 53

СЁНЬНЯ У НУМАРЫ

ЛІСТ ТАВ. ГІКАЛО РАБОЧЫМ МАГІЛЕЎСКАЙ ШАЎКОВАЙ ФАБРЫКІ (1-ая стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Зьберагчы і выгадаваць высокаякаснага каня. П. ГОРЫН — Навукова-дасьледчая работа ў другой пяцігодцы (2 ст.). К. ВЕРАМЕЙЧЫК — Старобінская партарганізацыя ў барацьбе за веснавую сяўбу (3 стар.). МЗЕЗІТ — Больш канкрэтнай узаемадапамогі ў рабоце вайсковых і грамадзянскіх ячэек Асоавіяхіму (3 стар.).

Пра санітарнае становішча школ і мерапрыемствы па далейшым паляпшэньні санітарнага становішча школ — пастанова СНК БССР (1 стар.).

Аб фактах разбазараньня хлеба ЗРК бабруйскага лесакамбінату—пастанова ЦК КП(б)Б (2 стар.).

Жыткавіцкі раён паказаў узоры бальшавіцкай барацьбы за веснавую сяўбу (1 стар.).

Перадавыя заводы Менску просяць саюзны ўрад выпусьціць пазыку імя чацьвертага, заключнага (1 стар.).

Пратэсты працоўных БССР супроць разгрому ТБШ і ліквідацыі школьніцтва (4 стар.).

Ліст т. Гікало рабочым Магілеускай шаўковай фабрыкі

Магілеў, дырэктару шаўковай фабрыкі, ячэйцы, фабкому, рабочым, інжынэрна-тэхнічнаму пэрсаналу

ВАША БАЛЬШАВІЦКАЯ БАРАЦЬБА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ 6 УМОЎ тав. СТАЛІНА ЗАБЯСЬПЕЧЫЛА ФАБРЫЦЫ ПОСЬПЕХ У ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ ДРУГОГА КВАРТАЛУ. ЦК ВІТАЕ ВАС З ПЕРАМОГАЙ НА ФРОНЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА. ЦК УПЭЎНЕНЫ Ў ТЫМ, ШТО НА АСНОВЕ ДАЛЕЙШАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧЫХІ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ НА БАРАЦЬБУ ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ, НА Г. АКТЫЧНАЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ 6 ГІСТАРЫЧНЫХ УКАЗАНЬНЯЎ тав. СТАЛІНА, ФАБРЫКА ДАБ'ЕЦЦА НОВЫХ ПОСЬПЕХАЎ І ПЕРАМОГ.

УПЕРАД ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Зьберагчы і выгадаваць высокаякаснага каня

Саюзны ўрад у сваёй пастанове аб разьвіцьці і захаваньні конскага паголоўя адносіць Беларусь да тых краёў і рэспублік, дзе «ўсё яшчэ ёсьць нядбайнае выкарыстаньне і няправільная эксплёатацыя конскага паголоўя, невыстарчальнае забесьпячэньне кармамі і празьмерная зморанасьць коняй, вусім недапушчальны ўпадак коняй і невыстарчальная ўвага да справы коннаднаўленьня».

Аналіз ходу сяўбы па радзе раёнаў БССР лішні раз пацьвярджае правільнасьць пастаноў партыі і ўраду. За нагардзівыя адносіны да каня, нядбайны догляд, разбазарваньне конскай цягавай сілы рад раёнаў і калгасаў зараз расплачваюцца ў працэсе сяўбы.

Возьмем, як прыклад, Уваравіцкі раён, які знаходзіцца ў глыбокім тыле пасеўнай (засеяў на 25 мая 28 проц. яравога кліну). Колькасьць рабочых коняй у калгасах гэтага раёну за апошнія паўгода зьменшылася на 700 штук. На працягу зімы і вясны коні ў радзе калгасаў раёну былі зусім бяспрытульнымі. У Барысаўскім раёне, які таксама значна адстае ў сяўбе, колькасьць рабочых коняй у калгасах за пяць месяцаў зьменшылася на 449 штук. Такое становішча ў Заслаўскім раёне і радзе іншых.

Факты апошніх дзён гавораць аб тым, што недаацэнка каня ў сельскай гаспадарцы і ў транспарце, неразуменьне значэньня яго для абароны і ў выніку дрэнны догляд і ўтрыманьне коняй—пашыраная зьява. Так, яшчэ ўчора селькор Муравейка з Хэйніцкага раёну паведамляе, што ў калгасе **імя Дзяржынскага** рабочыя коні ходзяць бяз усякага догляду. І за час палявых работ, у выніку абязьлічкі, загінула 4 коняй. Ход сяўбы ў калгасе імя Дзяржынскага злачынна марудны.

У калгасе **«Чырвоны Кастрычнік»**, Жлобінскага раёну, на працягу ўсёй зімы коні стаялі ў маленькім хляве ня прывязанымі. Коні не прымацаваны да конюкаў. Апошнія аплачваюцца выключна ад колькасьці, а не ад якасьці догляду коняй. У выніку—за апошні месяц загінулі чатыры кані.

У радзе раёнаў і калгасаў пашырана «тэорыя» аб «непатрэбнасьці каня, што яго заменіць трактар». На практыцы гэта тэорыя зьяўляецца манэўрам клясавага ворага, які шляхам разбазараньня конскай цягавай сілы імкнецца аслабіць гаспадарчую магутнасьць калгасу, не дапусьціць іх далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня, падарваць пягавую сілу сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Але-ж ці можам мы забываць пра тое, што хоць у канцы другой пяцігодкі на палёх СССР будуць працаваць і 170 тыс. трактараў, але яны ўсё-ж ня змогуць абслужыць поўнасьцю нашы пасеўныя плошчы. Нельга забываць таксама і тато, што конь патрэбен ня толькі ў сельскай гаспадарцы. Значэньне каня ў якасьці транспартнай сілы яшчэ доўгі час будзе вялікае. Нарэшце, значэньне каня для абароны краіны. Наша коньніца, якая пакрыла сябе сусьветнай славай у гады грамадзянскай вайны, і зараз застаецца магутнай зброяй абароны савецкіх межаў. Асабліва аб гэтым трэба памятаць у нас, у БССР, на рубяжы з капіталістычным сьветам.

Конь не працаўнік трактара, а яго дапаможнік на сацыялістычных палёх. Не процістаўленьне каня мэханічным рухавіком, а іх спалучэньне дае найбольшы эфэкт—аб гэтым павінен памятаць кожны гаспадарнік, кожны калгасны брыгадзір, кожны калгасьнік.

Але-зьберагчы каня—гэта толькі адзін бок пытаньня. Ня меншае значэньне мае і конягадоўля ў тым, каб на працягу бліжэйшага часу памножыць наша конскае паголоўе.

У мінулым годзе конская злучная кампанія па БССР была сарвана. У гэтым годзе ход злучной кампаніі зноў яўна нездавальняючы. Так, на калгасах БССР плян злучкі выканан толькі на 9 проц.

Трэба падкрэсьліць, што значэньне конягадоўлі апартуністычна недаацэньваецца ня толькі многімі раённымі, але і радам цэнтральных арганізацый. Так, у трэсьце **Сьвінавод**, які мае звыш 70 саўгасаў і каля 6.000 коняй, ніякіх вестак аб ходзе злучной кампаніі за апошнія два месяцы няма. Няма нават уліку колькасьці камбыл і племянных жарабцоў. Па саўгасах **Малакапрамтрэсту** плян злучной паводле прыблізных падлікаў выкананы на 30 проц. Аб тым, як сапраўды праводзіцца злучная ў саўгасах у жывёлагадоўчых трэстах ня ведаюць. Яшчэ горш, гэтым ніхто ня цікавіцца. У раёнах наогул наглядаецца цуднае нежаданьне займацца справамі конягадоўлі. Значная частка злучных пунктаў бязьдзейнічае. У Слуцкім раёне на злучныя пункты замест 24 вытворнікаў пастаўлена 10, з 6.900 матак пакрыта толькі 206. У Смалявіцкім раёне племянны вытворнік заводзкай стайні скарыстоўваецца не для злучной, а для разьездаў дырэктарам саўгасу імя Леніна. У Горацкім і Гарадоцкім раёнах племянныя жарабцы таксама скарыстоўваюцца не па простым прызначэньні, а для разьездаў работнікаў РВК і міліцыі. Рад раёнаў, як Аршанскі, Бабруйскі, Бярэзінскі скарачаюць пляны аднаўленьня коняй.

Трэба адзначыць недаацэнку справы конягадоўлі і Наркамзем БССР. 27 красавіка саюзны Наркамзем за подпісам тав. Якаўлева прапанаваў Наркамзему БССР стварыць на працягу двух тыдняў конягадоўчы сэктар. 19 мая тав. Якаўлеў яшчэ раз паўтарыў аб неабходнасьці безадкладнага стварэньня конягадоўчага сэктару. Калегія Наркамзему БССР нават ні разу не абмеркавала гэтага пытаньня.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 27 мая падкрэсьлівае, што «да справы зьберажэньня коняй, паляпшэньня іх якасьці, арганізацыі належнага кармленьня і аднаўленьня павінна быць праяўлена такая-ж увага, якая праяўляецца ў адносінах да пасеўных кампаній». Гэта значыць, што захаваньне і разьвіцьцё конскага паголоўя павінна зараз стаць баявой арганізацыйнай задачай як цэнтральных, так і раённых зямельна-калгасных арганізацый БССР.

Трэба рэзка ўзьняць адказнасьць калгаснага брыгадзіра, калгаснай брыгады за каня. Толькі замацаваньне коняй за пастаяннай брыгадай, за калгасьнікамі, якія на іх працуюць, толькі аплата конюхаў ад якаснага стану коняй забясьпечыць іх захаваньне.

Работа конскага злучнога пункту павінна зараз быць узята пад жорсткі штодзенны кантроль. Трэба максымальна скарыстаць спрыяючы час, які яшчэ застаўся, каб ліквідаваць адставаньне ў злучной.

Вакол пастаноў партыі і ўраду трэба мабілізаваць увагу шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў. Трэба з усёй рашучасьцю зламаць недаацэнку каня і забясьпечыць далейшы рост важнейшага сродку вытворчасьці ў народнай гаспадарцы.

ЖЫТКАВІЦКІ РАЁН ПАКАЗАЎ УЗОРЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ

Баявая задача ільнаводчых раёнаў—да 5 чэрвеня скончыць сяўбу тэхкультур, забясьпечыць добраякасным сыцом тэкстыльную прамысловасьць Савецкага саюзу

Ліквідаваць адставаньне ў сяўбе тэхкультур

ЧАВУСЫ. (Па тэлеграфу). На 1 чэрвеня па Чавускім ільнаводным раёне засеяна **57 проц.** яравога кліну. Калгасы выканалі свой плян на **58 проц.**, аднаасобнікі—на **55,4 проц.** Прырост за апошнюю пяцідзеўку мая па раёне складае **33,2 проц.**, замест **15 проц.** у мінулую пяцідзеўку.

Ня гледзячы на значны скачок уверх, усё-ж агульныя тэмпы сяўбы нельга прызнаць здавальняючымі, бо ўсе тэрміны скончэньня сяўбы для Чавускага раёну ўжо прайшлі.

Асабліва ганебнае адставаньне назіраецца з сяўбой тэхнічных культур. Па раёне **трэба засеяць 8.800 га ільну. На 20 мая плян сяўбы ільну выканан на 0,6 проц., на 25 мая было засеяна толькі 682 га, або 7,8 проц. пляну.**

Зусім правільна, што Чавускі раён «Зьвяздой» занесен на чорную дошку. Адсутнасьць належных бальшавіцкіх тэмпаў сяўбы тлумачыцца слабым змаганьнем за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, «лявацкай» недаацэнкай аднаасобнага сэктару.

У выніку слабай масава-растлумачальнай работы вакол пасеўнай ва многіх калгасах аслабла працоўная дысцыпліна. Дырэктыва сакратара ЦК КП(б)Б **т. Шаранговіча** аб учышчыленьні рабочага дня ня ўсюды выкананa. Характэрна, што за май месяц большасьць калгасаў і аднаасобнікаў з-за розных рэлігійных сьвят не працавалі 12 дзён, што значна адбілася на ўчышчыленьні тэрмінаў сяўбы.

«Лявацкая» недаацэнка аднаасобніка, несваячасовае правядзеньне зямляўпарадкаваньня, падчас адвод зямлі аднаасобнікам па вельмі далёкай адлегласьці ад месца пражываньня таксама значна адбілася на посьпеху сяўбы. Адначасова раённыя арганізацыі ня ўжывалі адпаведных захадаў для націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія сабатуюць, ня выконваюць цьвёрдых заданьняў па сяўбе.

У сяўбе асабліва адстаюць некаторыя саўгасы. Саўгас **«Усход»** на 1 чэрвеня з **500** га засеяў толькі **106** га, або **22 проц.** Саўгас **«Камінтэрн»** з **560** га засеяў толькі... **6** га ячменю і падрыхтаваў для пасеву плошчу ў 88 га. Рэшта яравога кліну ў саўгасе «Камінтэрн» ня толькі не засеяна, але нават для сяўбы не падрыхтавана глеба. Між тым, усе ўмовы для пасьпяховай сяўбы ёсьць. Насеньнем саўгас поўнасьцю забясьпечан.

У процілегласьць саўгасу «Усход» і «Камінтэрн», іншыя саўгасы, як **«Вайнілы»**, **«Ялава»**, мабілізаваўшы рабочых, правільна арганізавалі працу, з **посьпехам скончылі сяўбу.**

Па калгасным сэктары першым па раёне скончыў сяўбу калгас **«Камунар»**, Волкавіцкага сельсавету, які **засеяў 400 га, у тым ліку 127 га ільну-даўгунцу.** Калгас «Камунар» і ў мінулым годзе першым скончыў сяўбу па раёне, здаў дзяржаве 117 цэнтн. ільнавалакна першага гатунку. **Калгас «Камунар» павінен быць прэміяваны.**

Таксама скончылі сяўбу калгасы: **«Чырвоны сьцяг»**, **«Чацьверты заваршальны»**, камуна **«Серп і молат»** і яўрэйскі нацыянальны калгас імя **Гіршы Лекерта.**

Посьпех перадавых калгасаў і саўгасаў таворыць за тое, што ў Чавускім раёне ёсьць усе ўмовы для выкананьня пасеўпляну па 100 проц. 5 чэрвеня, асабліва па сяўбе тэхнічных культур—ільну.

Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б ДУБІНА.

Старшыня ЦВК т. Чарвякоў і сакратар ЦК КП(б)Б т. Іваноў—у Віцебску

ВІЦЕБСК. (Сьпешнай поштай). У Віцебскі раён для ўзмацненьня тэмпаў сяўбы прыбылі старшыня ЦВК т. Чарвякоў і сакратар ЦК КП(б)Б т. Іваноў. У гутарцы з супрацоўнікамі друку т. Чарвякоў адзначыў недапушчальнае адставаньне Віцебшчыны ў сяўбе. Нават пасьля сыгналаў ЦК і занясеньня Віцебшчыны ЦО ЦК КП(б)Б «Зьвяздой» на чорную дошку ўсё-ж такі адставаньне не ліквідавана.

Ухваляючы ініцыятыву фабрыкі «Дзьвіна» і маслазаводу, якія накіравалі ў калгасы лепшых ударнікаў, тав. Чарвякоў падкрэсьліў, што неабходна распачатую кампанію ўліку аб'ектаў абкладаньня і канкрэтнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК аб збожжа і мясазагатоўках прасякнуць упартай барацьбой за хутчэйшае і лепшае скончэньне сяўбы, за зьняцьце раёну з чорнай дошкі.

Тав. Чарвякоў упэўнен, што партарганізацыя перадавога пралетарскага раёну—Віцебшчыны ўскладзеныя на яе партыяй баявыя задачы па веснавой сяўбе выканае з гонарам. Плян сяўбы зусім рэальны. Доказам гэтага зьяўляюцца перадавыя калгасы, якія выканалі і перавыканалі свае пасеўныя пляны. На перадавых павінны раўняцца адстаючыя.

ЦК КП(б)Б—Гікало, старшыні СНК—Галадзеду НКЗБ—Рачыцкаму, рэдакцыі газэты „Зьвязда“

ЖЫТКАВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ПА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ Ў 1.000 ГА ПЕРАВЫКАНАН. ЗАСЕЯНА 1.100 ГА.

ПЕРАКЛЮЧАЕМСЯ НА ПРАПОЛАЧНУЮ І НА ПАДРЫХТОЎКУ ДА УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ.

Сакратар РК КП(б)Б БАГДАНАЎ.
Старшыня РВК БУЦЬКО.
Загадчык райза БУЯНАЎ.

Жыткавічы, Райком партыі, РВК, МТС, РАЙЗА

ШЛЕМ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ПЕРАДАВІКОМ БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА СЯЎБУ. КІРАЎНІКІ, РАБОЧЫЯ І КАЛГАСЬНІКІ ВАШАГА РАЁНУ ПАКАЗАЛІ, ШТО ЯНЫ НА СПРАВЕ МОГУЦЬ ВЫКОНВАЦЬ ЗАДАЧЫ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ УсеКП(б) І РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ СССР ПЕРАД БССР.

ПРАЦЯГВАЙЦЕ І НАДАЛЕЙ НЕАСЛАБНА ВЕСЬЦІ БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Наркамзем БССР РАЧЫЦКІ.

ЦК КП(б)Б—Гікало, СНК БССР—Галадзеду, рэдакцыі „Зьвязда“

ВУШАЧЫ, (Малапка).

Калгас «НОВЫ ШЛЯХ», Сіроцінскага сельсавету, датэрмінова скончыў сяўбу яравых культур на плошчы 585 га. Калгас аказаў дапамогу, двум адстаючым калгасам 70 працаднямі. Лепшыя ўдарнікі сяўбы прэміяваны.

Старшыня калгасу ТЫЧЫНА.
Сакратар парт'ячэйкі КАБЯК.

Чырвоны сьпіс

кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае і хутчэйшае скончэньне веснавой сяўбы

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (Па тэлеграфу).

31 МАЯ ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ РАЁН СКОНЧЫЎ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ. ЗАМЕСТ 16.990 ГА ЗАСЕЯНА 16.992 ГА.

***

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

Калгас імя «Правды» 31 мая скончыў сяўбу, выканаўшы плян на 100 проц., а разам з гародамі, якія засеяны калгасьнікамі,—на 128 проц.

***

БРАГІН. 31 мая поўнасьцю скончылі сяўбу калгасы **«Ударнік»**, **«Чырвоная Беларусь»**, **«Чырвоны Рог»**, **«Чырвоны партызан»**, **«Будзённы»**, **«Пераможны»**, **«Міхалёўка»**, **«Чырвоная Гара»**, **«Ільня»**, **«Чырвоная зорка»**.

Калгасы, скончыўшыя сяўбу, арганізоўваюць буксір на дапамозе адстаўшым.

***

МАЗЫР. (Па тэлеграфу). Калгас **«1 мая»** скончыў сяўбу яравых, выканаўшы плян на 109 проц., а па тэхнічных культурах—на 115 проц. Калгас імя Леніна выканаў пасеўны плян на 100 проц.

***

РЭЧЫЦА. (Па тэлеграфу). Калгас **«Ленінскі шлях»**, Бязуёўскага сельсавету, выканаў пасеўны плян на 100 проц. Сяўба працягваецца за кошт пашырэньня пасеўнай плошчы.

Аб забароне РайЗА і калгассаюзам самаўласна зьліваць калгасы

Пастанова калегіі НКЗ і праўленьня Калгасцэнтру БССР

З прычыны таго, што ў большасьці выпадкаў зьліцьцё калгасаў праводзіцца без выстарчальных падстаў і без сапраўднай згоды на гэта саміх калгасаў і калгасьнікаў, а ва многіх выпадках наносячы страты такімі зьліваньнямі значным групам калгасьнікаў, калегія НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляюць:

1. Забараніць райза і калгассаюзам рабіць зьліцьцё калгасаў без зацьвярджэньня ў кожным асобным выпадку НКЗ і Калгасцэнтру.

2. Папярэдзіць райза і калгассаюзы, што тыя, хто парушыць гэту пастанову, будуць прыцягвацца да суровай адказнасьці.

Наркамзем РАЧЫЦКІ.
Старшыня Калгасцэнтру МІЦЬКОЎ.

Пра санітарнае становішча школ і мерапрыемствы па далейшым паляпшэньні санітарнага становішча школ

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя пра санітарнае становішча школ і мерапрыемствы па далейшым паляпшэньні санітарнага становішча школ, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што санітарнае становішча большасьці школ зьяўляецца нездавальняючым.

Органы аховы здароўя, раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы не зварачаюць належнай увагі на арганізацыю справы гігіенічнага выхаваньня, на паляпшэньне фізычнага разьвіцьця школьнікаў і набыцьця імі санітарных навыкаў; раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія саветы і органы аховы здароўя не забясьпечылі сыстэматычнага санітарнага нагляду за школамі, не наладзілі санітарна - культурнай і пэдалёгічнай працы з вучнямі; многія загадчыкі школ не зварачаюць належнай увагі на санітарнае становішча школ; зусім слаба ўцягнута грамадзкасьць у справу санітарнага становішча школ і гігіенічнага выхаваньня вучняў.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя, Народнаму Камісарыяту Асьветы, раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам неадкладна правесьці належную санітарную ачыстку тэрыторыі школ і школьных памяшканьняў; забясьпечыць школы вешалкамі, бакамі для гатаванай вады, умывальнікамі, ручнікамі, наладзіць у школах вэнтыляцыю і інш.

Адказнасьць за санітарнае станавішча школ і належнае санітарнае ўтрыманьне апошніх усклаасьці на загадчыкаў школ.

2. З мэтай барацьбы з эпідэмічнымі і паразітарнымі хваробамі сярод школьнікаў прапанаваць органам аховы здароўя і адміністрацыі школ вызначыць для школ спэцыяльныя дні ў лазьнях, забясьпечыць нагалоўную вакцынацыю і рэвакцынацыю школьнікаў на воспу да канца 1932 г. і на меры патрэбы рабіць прышчэпкі супроць дыфтэрыі і шкарлятыны; устанавіць сыгналізацыйны ўлік эпідэмічных захворваньняў сярод вучняў і забясьпечыць своячасовую і належную дэзынфэкцыю школьных памяшканьняў; забясьпечыць сталы сыстэматычны цялесны мэдычны агляд школьнікаў ня менш аднаго разу ў месяц і больш паглыблены агляд ня менш двух раз у навучальным годзе, аказваючы належную мэдычную дапамогу хворым вучням; устанавіць пэрыядычны санітарны агляд школьных памяшканьняў ня менш двух раз у месяц; праводзіць сыстэматычную санітарна-культурную працу сярод вучняў і іх бацькоў па пытаньнях прафілактыкі эпідэмічных і паразітарных захворваньняў.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя забясьпечыць сталы нагляд за работай вучняў у часы вытворчага навучаньня, зьвярнуўшы належную ўвагу на тэхніку бясьпечнасьці, адпаведнасьць станкоў і прылад разьвіцьцю дзяцей, пармаваньне нагрузкі і інш.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы правесьці належныя мерапрыемствы па пашырэньні плошчы майстэрань і рабочых пакояў пры школах, забясьпечыўшы апошнія абсталяваньнем і ўстанавіць належны санітарны пар[illegible]

4. Для пашырэньня плошчы школьных памяшканьняў і забесьпячэньня школ ад заносу інфэкцый, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам разам з органамі Народнага Камісарыяту Асьветы ужыць рашучыя захады да высяленьня прыватных жыхароў з школьных будынкаў, якія ня маюць дачыненьня да школы; забараніць правядзеньне ў школьных памяшканьнях рознага роду вечарынак, якія ня маюць дачыненьня да выхаваўчай працы школы; своячасова праводзіць бягучы рамонт школьных памяшканьняў.

5. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя і Народнаму Камісарыяту Асьветы зьвярнуць асаблівую ўвагу на распрадоўку стандартаў школьнай мэблі.

6. Даручыць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя ўстанавіць сыстэматычны санітарна - тэхнічны нагляд за новым школьным будаўніцтвам, капітальным рамонтам школ і прыёмам гатовых пабудоў, а раённым выканаўчым камітэтам гарадзкім саветам і будаўнічым арганізацыям пяўхільна сачыць за выкананьнем санітарна-тэхнічнага нагляду.

7. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя і Народнаму Камісарыяту Асьветы забясьпечыць узьняцьце ўзроўню санітарна-гігіенічных ведаў сярод настаўнікаў і тэхнічнага пэрсаналу школ праз арганізацыю спэцыяльных курсаў і ўключэньне ў плян курсаў па перападрыхтоўцы настаўніцтва пытаньняў школьнай гігіены; разгарнуць шырокую санітарна-асьветную працу сярод бацькоў вучняў.

8. Рэарганізаваць існуючую школьна-санітарную арганізацыю ў школьна-санітарную інспэкцыю Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя, абавязаўшы апошнюю правесьці рашучую барацьбу за санітарнае паляпшэньне становішча школ. Надаць школьна-санітарным інспэктарам правы дзяржаўных інспэктароў санітарнага нагляду.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя правесьці гэту рэарганізацыю да канца 1932 г., прыцягнуўшы да працы па школьна-санітарнай інспэкцыі актыў сэкцый аховы здароўя і народнай асьветы гарадзкіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў, ЛКСМ, дзіцячую камуністычную арганізацыю юных піянэраў і бацькоў вучняў.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Асьветы ў дэкадны тэрмін распрацаваць і выдаць палажэньне аб школьна-санітарнай інспэкцыі.

9. Абавязаць Народны Камісарыят Аховы Здароўя і Народны Камісарыят Асьветы ў верасьні месяцы далажыць аб выкананьні гэтай пастановы.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР А. КАЛНІН.

Намесьнік кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР Я. ЭЛЬКІН.

г. Менск.
28 мая 1932 г.

ПЕРАДАВЫЯ ЗАВОДЫ МЕНСКУ ПРОСЯЦЬ САЮЗНЫ УРАД ВЫПУСЬЦІЦЬ ПАЗЫКУ ІМЯ 4-га ЗАКЛЮЧНАГА

Пазыкай ударым па ворагах бальшавіцкіх тэмпаў

Да ўсіх рабочых, работніц, калгасьнікаў і працоўных БССР

Таварышы!

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам лепінскай партыі і яе ЦК, на чале з тав. Сталіным, рабочая кляса Савецкага саюзу заваёўвае адну перамогу за другой, пасьпяхова завяршае першую пяцігодку за чатыры гады і гэтым самым стварае асноўныя прадпасылкі для выраш эньня сусьветна-гістарычнай задачы, пастаўленай XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй,—пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Усё шырэй і шырэй разгортваецца сацыялістычнае будаўніцтва. Усё больш і больш гігантаў індустрыі ўваходзяць у строй. Мы ведаем, што пуск новых фабрык і заводаў патрабуе вялізарных сродкаў. Толькі ў заключным годзе пяцігодкі мы павінны ўкласьці ў капітальнае будаўніцтва ва ўсе галіны народнай гаспадаркі звыш 24 млрд. руб. Гэтыя сродкі рабочыя і працоўныя нашай краіны павінны адшукаць у сябе.

Таму мы, двухтысячны рабочы калектыў **чырвонасьцяжнай фабрыкі «Кастрычнік»**, выканаўшы па-бальшавіцку пяцігодку шэйнай прамысловасьці за тры гады, з месяца ў месяц перавыканаўшы свой прамфінплян, **патрабуем ад савецкага ўраду неадкладнага выпуску пазыкі чацьвертага году пяцігодкі.**

Мы ўпэўнены ў тым, што рабочая кляса нашай краіны горача адгукнецца на наш заклік. Са свайго боку абавязваемся ў самы кароткі час рэалізаваць пазыку, забясьпечыць 100 проц. ахоп рабочых падпіскай ня менш чым на месячны заработак.

Пазыкай чацьвертага, заключнага году пяцігодкі ўдарым па імпэрыялістах—падпальшчыках новай вайны, па клясавым ворагу і яго агентуры, па праціўніках бальшавіцкіх тэмпаў—правых і «левых» апартуністах.

Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва! Няхай жыве камуністычная партыя і яе лепінскі ЦК—кіраўнік сацыялістычных перамог!

(Прынята на агульна-фабрычным мітынгу рабочых 2-га чэрвеня).

Выклік ударнікаў саўгасу „Івань“

Да ўсіх саўгасаў і калгасаў БССР

На працягу першай пяцігодкі ў Савецкім саюзе вырасьлі магутныя гіганты прамысловасьці і сельскай гаспадаркі: Днепрабуд, Магнітагорск, Сталінградзкі трактарны, завод імя Сталіна, «Шарыкопадшыпнік», імя Кагановіча. Шпаркімі тэмпамі разгортваецца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі. Саўгасы, як прадпрыемствы пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу, ператварыліся ў буйныя фабрыкі хлеба мяса і малака. Сацыялістычны сэктар вёскі заняў цэнтральнае і пераважнае месца па ўсіх паказьніках вытворчасьці.

Гэтыя перамогі дасягнуты дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі і лепінскай нацыянальнай палітыкі, у рашучай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай. У той час, як сацыялістычная гаспадарка СССР разьвіваецца шпаркімі тэмпамі, у капіталістычных краінах пагыбляецца эканамічны крызіс, расьце беспрацоўе; капіталістычны сьвет шукае выхаду з крызісу праз узбраеньне і падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР.

Абавязак кожнага рабочага, калгасьніка, бедняка і серадняка—аднаасобніка ўмацаваць дасягнутыя посьпехі, узмацніць абароназдольнасьць краіны, поўнасьцю выканаць і перавыканаць плян чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Мы, рабочыя спэцыялісты саўгасу **«Івань» (Слуцкі р-н), поўнасьцю скончыўшы выплату адлічэньняў за пазыку імя трэцяга, рашаючага**, у мэтах забесьпячэньня выкананьня першай пяцігодкі за чатыры гады, просім урад СССР выпусьціць пазыку чацьвертага, заключнага году пяцігодкі. Выклікаем усе саўгасы і калгасы падтрымаць нашу ініцыятыву.

На даручэньні агульнага сходу рабочыя - ўдарнікі саўгасу «Івань»: **Ф. Шкляраўскі, М. Шчамкун, У. Урбан, Я. Хавустовіч, А. Перапецкі, М. Юруц, Я. Каленка, М. Семяновіч, А. Барадзін, Б. Шапіра, А. Кохан, У. Купрэйчык, М. Адамовіч, Я. Кавалёнка, С. Хаванская і Д. Міхнюк.**

Заклікаем усіх рабочых падтрымаць нашу ініцыятыву

Чырвонасьцяжная гарбарня «БАЛЬШАВІК», пад кіраўніцтвам партарганізацыі заводу, выканала прамфінплян 1931 г. на 27 дзён раней тэрміну. Праграма першага кварталу 1932 г. таксама перавыканана па колькасных паказьніках на 1,9 проц., у цэнасным азначэньні — на 108,3 проц.; сабекошт зьніжан на 7,4 проц. Прамфінплян за красавік выканан гарбарняй у колькасным азначэньні на 100,1 проц., у цэнасным — на 105,2 проц. Заданьне за 25 дзён мая выканана заводам адпаведна на 102,1 проц. і на 101,17 проц.

Такія-ж бальшавіцкія тэмпы мы паказалі і ў рэалізацыі пазыкі імя трэцяга, рашаючага. Сярэдні месячны фонд зарплаты ў 1931 г. складаў 79.431 р., аблігацый пазыкі рэалізавана на 93 тыс. р., або 117 проц.

Мы добра ведаем, што задача пасьпяховага завяршэньня першай пяцігодкі за чатыры гады і лепшай падрыхтоўкі да другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, патрабуе шмат энэргіі і сродкаў, якіх нам ня дасьць ні адна капіталістычная краіна. Гэтыя сродкі патрэбны для таго, каб здабыць у апошнім годзе першай пяцігодкі 100 млн. тон вугалю, 10 млн. тон чыгуну, пабудаваць 1.700 машына-трактарных станцый, усямерна ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны. ПАТРЭБНЫЯ СРОДКІ МЫ ПАВІННЫ МАБІЛІЗАВАЦЬ УНУТРЫ КРАІНЫ.

Таму мы ПРОСІМ УРАД САЮЗУ ВЫПУСЬЦІЦЬ НОВУЮ ПАЗЫКУ — ПАЗЫКУ ЧАЦЬВЕРТАГА, ЗАКЛЮЧНАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Т. т. рабочыя, работніцы, інжынэры і тэхнікі, служачыя, калгасьнікі, беднякі і сераднякі — аднаасобнікі Менску — чырвонай сталіцы БССР! Мы, ударны калектыў чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік», заклікаем вас ПАДТРЫМАЦЬ НАША ХАДАЙНІЦТВА да ўраду БССР аб выпуску новай пазыкі і, пры ўмове задавальненьня нашай просьбы ўрадам Саюзу, разгарнуць бальшавіцкае змаганьне за рэалізацыю новай пазыкі, за выкананьне і перавыкананьне заданьняў шляхам уздыму сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Ад імя першага хромавага цэху — рабочыя ФРЫДЛЯНД, КАРПІЦКІ, КАЧУКО, ПАГОЦКІ, ЛЕВІТ, МІЛІКОЎСКІ, СЕРАБРАНСКІ.

Ад імя другога хромавага цэху— ГІТЛІЦ, ГЕФЭНД, САЕВІЧ, МУРОХ, ДУШАЦКІ, ВАЙЧУК.

Ад імя маханічнага, жэлятыннага цэху і складу сырцу: ФІШКІН, УСЬЦІНАЎ, ГОЛЬДБЭРГ, ШТЭЙНБАУМ, САДОЎСКІ.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

З 10 ЧЭРВЕНЯ—МЕСЯЧНІК УДЗЕЛУ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ДАРОЖНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

Рэалізацыя 6 умоў т. Сталіна, шырокае разгортваньне палітычна-масавай работы і сацыялістычнага спаборніцтва забясьпечаць выкананьне плянаў барацьбы з бездарожжам

Пастанова Цэнтральнага штабу па дарожным будаўніцтве пры ЦК КП(б)Б

1. Улічваючы наяўнасьць вельмі сур'ёзных прарываў у выкананьні важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы-плянаў як агульна-дзяржаўнага, так і мясцовага дарожнага будаўніцтва і **надаючы выключнае значэньне працоўнаму ўдзелу і ўдзелу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці** ў справе бальшавіцкай барацьбы за дарогу, **абвясьціць з 10 чэрвеня месячнік штурму прарываў у дарожным будаўніцтве і працоўнага ўдзелу ў ім насельніцтва,** згодна новага закону, выданага ЦВК і СНК БССР у гэтым годзе (апублікаванага ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 22 мая 1932 г.).

2. Асноўнай задачай месячніка штурму паставіць мабілізацыю шырокіх мас рабочых калгасьнікаў, адназасобнікаў, беднякоў і серадняковў, а таксама ўсёй савецкай грамадзкасьці вакол справы ажыцьцяўленьня ўсяго пляну дарожнага будаўніцтва.

3. Маючы на ўвазе, што асноўным нэрвам масавага ўдзелу насельніцтва ў дарожным будаўніцтве зьяўляецца міжпар'е, **лічыць абавязковым скарыстаньне ўсіх 100 проц. гадавога пляну працоўнага ўдзелу ў месячніку штурму.** Прапанаваць раённым, сельскім і мясцовым штабам разгарнуць работу па працоўным удзеле такімі тэмпамі, каб забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне гэтай дырэктывы.

4. Прапанаваць райштабам па правядзеньні месячніка безадкладна разгарнуць **масавую работу** па растлумачэньні новага закону ЦВК і СНК БССР ад 21 мая 1932 г. па працудзеле насельніцтва.

5. Абвясьціць конкурс на лепшае правядзеньне месячніка і прапанаваць Галоўдартрансу да 5 чэрвеня апублікаваць умовы конкурсу ў друку.

6. У аднадзенны тэрмін (1-VI 1932 г.) мабілізаваць групу (10-15 чал). актыўных камсамольскіх і аўтадарожніцкіх работнікаў на найбольш адказныя вучасткі. Галоўдартрансу мабілізаваць да 5-VI 50 чал. студэнтаў-аўтадарожнікаў для ўзмацненьня работ па нізавой сетцы.

7. Абавязкова практыкаваць на працягу месячніка выезды ўсіх членаў штабу на месцы з мэтай праверкі і дапамогі райштабам у правядзеньні дарбудаўніцтва і працудзелу насельніцтва, а таксама практыкаваць выезды старшынь райштабаў, старшынь РВК і дарожных працаўнікоў на паседжаньні штабу з дакладамі аб ходзе месячніка.

8. Безадкладна распачаць кампанію праз цэнтральны і раённы друк па выпытаньні месячніка. Прапанаваць цэнтральным і раённым газэтам зьмясьціць рад растлумачальных артыкулаў аб новым законе аб працудзеле насельніцтва ў дарбудаўніцтве, асьвятляць ход абвешчанага конкурсу, перадаваць вопыт лепшых раёнаў, сельсаветаў, калгасаў і грамадзкіх арганізацый і ўстанавіць чырвоныя і чорныя дошкі.

Цэнтральным газэтам практыкаваць выязныя рэдакцыі сумесна з раённымі газэтамі і шматтыражкамі, а таксама практыкаваць пасылку брыгад.

9. Прыняць да ведама пастанову **ЦК ЛКСМБ** аб абвяшчэньні **ўсебеларускага камсамольскага суботніка па дарбудаўніцтве з 15 чэрвеня гэтага году.**

10. Адзначаючы выключна слабы ўдзел аўтадарожніцкіх арганізацый у дарожным будаўніцтве г. г., прапанаваць фракцыі ЦС Аўтадору БССР і ўсім ГК і РК КП(б)Б **у дзкадны тэрмін ужыць канкрэтныя меры да ўзмацненьня раённага зьвяна Аўтадору** (старшыні і сакратары райсаветаў таварыства). Абавязаць усе аўтадарожніцкія арганізацыі неадкладна ўключыцца ў месячнік штурму, усклаўшы на кожную ячэйку канкрэтныя абавязкі па ўдзеле ў дарожным будаўніцтве на ўвесь будаўнічы сэзон і шляхам разгортваньня сапраўды масавай работы прыцягнуць да ўдзелу ў дарожным будаўніцтве і месячніку шырокія колы працоўных.

11. Канстатуючы слабы ўдзел усёй сыстэмы Калгасцэнтру ў мінулым месячніку штурму, прапанаваць Белкалгасцэнтру даць паказаньні ўсёй сыстэме аб адказнасьці кіруючага складу за працудзел калгасьнікаў у дарбудаўніцтве і за правядзеньне дарог у праежджае становішча, усклаўшы **пэрсанальную адказнасьць за гэту работу на старшынь райкалгассаюзаў, старшынь калгасаў і загадчыкаў фэрм.**

12. Адзначаючы, што Трактарацэнтр да гэтага часу ня даў паказаньняў МТС аб скарыстаньні трактараў, як цягавай сілы на дарбудаўніцтве, прапанаваць кіраўніку Трактарацэнтру т. **Каршакевічу** безадкладна выкананць адпаведную дырэктыву.

13. Прапанаваць фракцыі ВСФК арганізаваць **эстафэту, прысьвечаную месячніку штурму.**

14. Штаб рашуча падкрэсьлівае, што толькі ўдарныя сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы забясьпечаць выкананьне плянаў дарожнага будаўніцтва ў тэрміны, вызначаныя партыяй і ўрадам.

ДАБІЦЦА КРУТОГА ПЕРАЛОМУ

Ва ўмовах шпаркага разгортваньня індустрыялізацыі краіны дарожнае будаўніцтва мае выключна важнае значэньне. Сваячасовая падвозка прадуктаў да чыгунак, пралетарскіх цэнтраў, дастаўка тавараў у вёску, наладжаньне культурнай сувязі з ёю — усё гэта патрабуе добрай дарогі.

Зараз пачаўся адказнейшы пэрыяд дарожнага будаўніцтва. Адтак, тэмпы разгортваньня яго надзвычайна нізкія. На 20 мая падвезена каменю да трасы 64 проц. пляну, гравія — 13 проц., лесу — 31 проц. і пяску — 12 проц. Зусім нездавальняюча ідзе разьбіваньне каменю: шчэбню загатавана 37 проц. пляну, шашак — 44 проц.

Аб чым сьведчаць такія ганебныя тэмпы? Яны сьведчаць аб тым, што, ня гледзячы на рад катэгарычных пастаноў партыі і ўраду апартуністычныя элемэнты ігнаруюць дарожнае будаўніцтва. На самой справе, маглі-ж **Дрысенскі** і іншыя раёны поўнасьцю выканаць плян загатовак будматар'ялаў. Яны гэтага дабіліся таму, што па-бальшавіцку змагаліся за плян, па-апэрацыйнаму кіравалі ходам работ, разгарнулі масава - палітычную работу вакол кампаніі і добра наладзілі культурна-бытавое абслугоўваньне працуючых.

Такія-ж раёны, як **Рэчыцкі, Камарынскі, Менскі, Віцебскі,** спадзяюцца на самацёк, ня кіруюць гэтай справай і таму цягнуцца ў хвасьце.

21-га мая выдана пастанова ЦВК і СНК БССР аб працоўным удзеле насельніцтва ў дарожным будаўніцтве. Сёньня мы зьмяшчаем пастанову цэнтральнага штабу па дарбудаўніцтве пры ЦК КП(б)Б аб абвяшчэньні з 10 чэрвеня месячніка працудзелу насельніцтва ў дарожным будаўніцтве. Гэтыя пастановы маюць выключна важнае значэньне. Працоўны ўдзел насельніцтва ў дарожным будаўніцтве — магутны сродак барацьбы за добрую дарогу.

Задача мясцовых арганізацый, разгарнуўшы масавае растлумачэньне гэтых пастаноў, давёўшы да кожнага калгасу, да кожнай вёскі, пабальшавіцку іх рэалізаваць. Чэрвень трэба ператварыць ва ўдарны месяц барацьбы з бездарожжам. Неабходна папярэдзіць, што за ўсякія «лявацкія» загібы, падмену масавай работы адміністраваньнем партыя будзе бязьлітасна біць.

Нізавы друк абавязан таксама распачаць вялікую апэрацыйную работу вакол штурму дарожнага будаўніцтва.

Правільным ажыцьцяўленьнем пастаноў ураду аб працоўным удзеле мясцовага насельніцтва ў дарожным будаўніцтве, рэалізуючы 6 умоў тав. Сталіна, наладзіўшы апэрацыйнае кіраўніцтва і палітычна - масавую работу, забясьпечым круты пералом у барацьбе за добрую дарогу.

Больш увагі рабочаму забесьпячэньню

Дарожна-будаўнічыя работы па 4-м вучастку разгортваюцца надзвычай марудным тэмпамі. Дрэнная арганізацыя працы — асноўная прычына гэтага. Адсутнічаюць дакладныя вытворчакалькуляцыйныя планы работ. Не да ўсіх брыгад даведзены заданьні. Не аддаецца патрэбнай увагі барацьбе за якасныя показальнікі дарожнага будаўніцтва. Дагэтуль загатоўлена 9 проц. пяску, вывезена каменьня 34 проц., гравія 18 проц., шчэбня — 18 проц.

Да 15 красавіка павінна было быць скончана будаўніцтва Будзілаўскага і Дабрэйскага мастоў. Але невядома, ці будзе закончана будаўніцтва і да 15 чэрвеня. Зусім дрэнна пастаўлена мэханізацыя работ. Замест 4 камендрабілак працуе толькі 2 і то з вялікімі перабоямі. Усе палуныя мэханізмы абязьлічаны. Скарыстоўваюцца яны надзвычай дрэнна. Так, у вёсцы Бярозкі другі год не працуе камендрабілка, а ў калгасе Молатава — два трактары. Аб іх нават ня ведаюць кіраўнікі дарбудвучастку. Быў выпадак, калі ў «Грэйдэра» парваўся ланцут. Для таго, каб яго адрамантаваць патрэбна затраціць ня больш 15 хвілін. Між тым, «Грэйдэр» стаіць у рамонце ўжо больш двух тыдняў. Камендрабілкі робяць вялікія прастоі з-за несваячасовай падвозкі гаручага.

Яшчэ горш з забесьпячэньнем рабочых. Была пастанова праўленьня віцебскага даркопу адкрыць сталоўкі па пекалькі вучастках (Будзілава і інш.), але па віне адказнага за гэта т. **Вярцелкіна** яны не адкрыты. Падвозка абедаў на месца работы арганізавана дрэнна. Замест 12 гадзін абеды дастаўляюцца ў 3-4 гадз. зусім халодныя.

Прафарганізацыя вучастку стаіць у баку ад гэтых пытаньняў. **Я.**

Аўтадор—на перадавыя вучасткі дарбудаўніцтва

ЦК КП(б)Б, Цэнтральнаму праўленьню Аўтадору і Цэнтральнаму савету Асоавіяхіму БССР

Чэрвеньская арганізацыя Аўтадору, сабраўшыся на ўрачысты вечар, прысьвечаны ходу дарожнага будаўніцтва, вітае ЦК КП(б)Б, ЦП Аўтадору і ЦС Асоавіяхім БССР.

Перад намі стаіць баявая, вялізарнейшага значэньня задача — да 1-га ліпеня скончыць будаўніцтва шашы на 8-м дарожна-будаўнічым вучастку. Пад кіраўніцтвам раённай партарганізацыі члены Аўтадору Чэрвеньшчыны будуць па-бальшавіцку змагацца за пасьляховае вырашэньне гэтай задачы, будуць з усёй настойлівасьцю і энэргіяй весьці ўдарную работу па прапагандзе задач Аўтадору, па ўцягненьні ўсіх членаў прафсаюзаў, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і беднякоў і серадняковў — адназасобнікаў у Аўтадор. Чэрвеньская арганізацыя Аўтадору бярэ шэфства над будаўніцтвам шашы на 8-м дарбудвучастку.

Няхай жыве КП(б)Б — правадыр і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве Аўтадор — шэф дарожнага будаўніцтва.

Прэзыдыум сходу.

Насустрач калгаснаму гандлю

Зломім кансэрватызм „Белдрэва" да вырабу прадметаў шырокага спажываньня

Задача разгортваньня савецкага гандлю настойліва патрабуе ад прамысловасьці максымальнага павялічэньня выпуску прадукцыі шырокага спажываньня. Посьпехі сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны поўнасьцю забясьпечваюць вырашэньне гэтай важнейшай праблемы. XVII партыйная канфэрэнцыя ў сваёй пастанове аб разьвіцьці прамысловасьці прызнала неабходным, «побач з вялізарным далейшым размахам у разгортваньні цяжкай індустрыі, разьвіваць лёгкую і харчовую прамысловасьці».

Разам з ростам дабрабыту рабочай клясы і калгасьнікаў растуць іх матар'яльна - культурныя запатрабаваньні. Таму перад сацыялістычнай прамысловасьцю стаіць адказная задача — ня толькі поўнасьцю рэалізаваць патрабаваньні народнай гаспадаркі на мэталь, лес, вугаль, машыны, утнаеньне і інш. прадукцыю, але і ўсямерна павялічваць выпуск прадметаў шырокага спажываньня.

Асабліва рэльефна выступае гэта задача зараз у сувязі з апошнімі пастановамі партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках, калгасным гандлі сельска - гаспадарчымі прадуктамі—адным з адказных зьвеньняў савецкага гандлю. У радзе раённаў БССР калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі адказалі на гэтыя пастановы павялічэньнем вывазу на рынак сельска - гаспадарчых прадуктаў. У бліжэйшыя часы паток сельска-гаспадарчай прадукцыі на рынак яшчэ больш узмацніцца. «Насустрач гэтаму патоку ў вёску па каналах савецкага гандлю павінен быць накіраван паток прамысловых тавараў шырокага спажываньня». («Правда»).

Было-б зусім няправільна думаць, што ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай задачы залежыць выключна ад лёгкай, харчовай індустрыі і прамысловай каапэрацыі. Зразумела, яны павінны дабівацца максымальнага павялічэньня выпуску сваёй прадукцыі. Але яшчэ лясная, мэталяапрацоўчая, машынабудаўнічая і іншыя галіны прамысловасьці не абавязаны змагацца за вырашэньне гэтай важнай праблемы? Яны таксама **павінны даць краіне на мільёны руб. тавараў шырокага спажываньня, звыш сваіх плянавых заданьняў.**

Надаўна ў «Зьвязьдзе» пісалася аб тым, што і за кошт якіх рэсурсаў можна вырабляць на мэталяапрацоўчых заводах. Белмэталяаб'яднаньне ўжо выпрацавала некаторыя мерапрыемствы ў гэтым напрамку.

Тое-ж павінна зрабіць лесаапрацоўчая прамысловасьць БССР.

Трэба адзначыць, што выраб прадукцыі шырокага спажываньня ў агульнай праграме «Белдрэва» займае зусім нязначную частку. З агульнага гадавога пляну выпуску валавой прадукцыі ў 60.585 тыс. руб. на долю прадметаў шырокага спажываньня прыпадае толькі 2.812 тыс. руб., або 4,6 проц., прычым з гэтай колькасьці амаль палова прадукцыі вырабляецца па заказах розных трэстаў і аб'яднаньняў для абсталяваньня савецкіх, гаспадарчых і навучальных устаноў. Зараз, паводле загаду Наркамлесу СССР, такія заказы скасаваны. Уся прадукцыя шырокага спажываньня паступіць выключна на рынак. Але ці можам мы абмежавацца толькі гэтым? Ні ў якім разе. **Дрэваапрацоўчая прамысловасьць мае ўсе магчымасьці максымальна пашырыць выпуск прадукцыі шырокага спажываньня за кошт мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, шляхам выкарыстаньня і пераапрацоўкі розных адкідаў, якіх ёсьць вялікая колькасьць на дрэваапрацоўчых заводах.**

Якую прадукцыю шырокага спажываньня вынускае зараз «Белдрэў»? Галоўным чынам, мэблю (шафы, сталы, крэслы). Уся гэта прадукцыя выпрацоўваецца выключна за кошт асноўнага сырцу, адкідаў-ж зусім не выкарыстоўваюцца і звальваюцца ва дварох.

Замест рашучых мер па выкарыстаньні гэтых адкідаў, па іх апрацоўцы на заводах, кіраўніцтва «Белдрэў» пайшло на лінію найменшага супраціўленьня. Частка лепшых адкідаў прадавалася Лесаспабзбыту, які ў сваю чаргу ўступаў іх розным арганізацыям.

Праўда, зараз «Белдрэў» намеціў некаторыя мерапрыемствы для выкарыстаньня адкідаў, у мэтах павялічэньня выпуску прадукцыі шырокага спажываньня. Але ўся гэта работа праходзіць пакуль што ў сьценах габінэтаў, на прадпрыемствах практычнага яшчэ нічога ня зроблена.

Што канкрэтнага намячае зрабіць кіраўніцтва «Белдрэў»? Адкрыць на заводах імя Молатава і Бабруйскім камбінаце цэльцэхі, якія будуць вырабляць простыя сталы, табурэткі, вешалкі, дзіцячую мэблю, кухонныя шафы, клеткі для трусоў і інш. Намечана выпусьціць на заводзе імя Молатава дадатковую прадукцыю на 160 тысяч рублёў, на Бабруйскім камбінаце — на 224 тысячы руб. Апрача гэтага на радзе заводаў мяркуецца арганізаваць спэцыяльныя брыгады, якія будуць заняты выключна на пераапрацоўцы адкідаў (на Барысаўскім камбінаце «Камінтэрн», на заводзе імя Томскага і інш.).

На заводзе імя Томскага павінна быць выраблена тонту на 20 тыс. руб., клетак для трусатнікаў — на 5 тыс. руб.; на Барысаўскім камбінаце памяцельнікаў — на 3.500 руб., качалак — на 7 тыс., вешалак — на 5 тыс. руб. Аднак, яшчэ ня зжыта тэндэнцыя ісьці на лінію найменшага супраціўленьня. Нават зараз «Белдрэў» намячае прадаць непрапрацаваныя адкіды на суму 10 тыс. руб. у год.

Нам. кіраўніка «Белдрэў» тав. **Гейнз** тлумачыць гэта «фізычнай і тэхнічнай немагчымасьцю для заводаў прапрацаваць усе адыходы». У гэтай заяве хаваецца коспасьць і кансэрватыўныя адносіны да вырашэньня адказных задач, якія пастаўлены перад прамысловасьцю.

Задача задаваленьня попыту шырокіх працоўных мас на прадметы шырокага спажываньня патрабуе ад прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасьці неадкладнага пераключэньня на поўную пераапрацоўку адкідаў, паладжаньне вырабу прадметаў хатняга ўжытку і інш.

Кансэрватызм у гэтай справе павінен быць зломлен.

Фралоў.

Аб фактах разбазарваньня хлеба ЗРК Бабруйскага лесакамбінату

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК канстатуе, што кіраўніцтва ЗРК Бабруйскага лесакамбінату ў асобе старшыні тав. Каплана, замест выкананьня простых дырэктыў партыі аб максымальнай эканоміі ў выдатканьні хлеба, займалася рвацтвам і безадказным выдатканьнем хлебных фондаў, бескантрольнай выдачай наборных дакумантаў, самавольным пераводам кантынгентаў з ніжэйшых катэгорый у вышэйшую, што прывяло да разбазарваньня 51.520 кгр. хлеба за адны толькі 4 месяцы 1932 г.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і дырэкцыя камбінату, замест прыняцьця рашучых мер барацьбы за жорсткую эканомію хлеба і паладжань не сапраўднага рабочага кантролю, прымірэнча аднесьліся да гэтых зьявішч, чым фактычна садзейнічалі разбазарваньню хлеба.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Пацьвердзіць пастанову бюро Бабруйскага РК КП(б)Б ад 15-V-32 г. аб выключэньні старшыні ЗРК Каплана з радоў КП(б)Б.

Даручыць пракуратуры рэспублікі ў дэкадны тэрмін разгледзець справу ЗРК Бабруйскага лесакамбінату аб разбазарваньні хлеба і бескантрольнай выдачы наборных дакумантаў і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

2) У адносінах сакратара парткому Бабруйскага лесакамбінату т. Рабкіна, дырэктара камбінату т. Тарасава і старшыні ФЗМК тав. Батукава, лічыць рашэньне Бабруйскага РК недастатковым і прапанаваць перагледзець у бок умацаваньня спагнаньня.

3) Прапанаваць Бабруйскаму РК КП(б)Б прыцягнуць да партыйнай адказнасьці загадчыкаў цэхаў камбінату, якія яўна перапавялічылі заяўкі на атрыманьне наборных дакумантаў.

4) Папярэдзіць усе партыйныя, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і гаспадарчыя арганізацыі, што ЦК КП(б)Б будзе прыцягваць да самай суровай партыйнай адказнасьці членаў партыі за факты разбазарваньня хлеба, неэкапомнага яго выдатканьня, неправядзеньня належнай барацьбы з фактамі разбазарваньня і неналаджаньне масавага кантролю за штодзённым выдатканьнем хлеба.

Пастанову апублікаваць у друку.

П. Горын

Навукова-дасьледчая работа ў БССР у другой пяцігодцы*)

III. Асноўныя намячэньні тэматыкі навукова-дасьледчай работы

Другая пяцігодка адкрывае шырокія пэрспэктывы для разьвіцьця грамадзкіх, прыродазнаўчых і тэхнічных навук і патрабуе далейшага паваароту навукі да практыкі сацыялістычнага будаўніцтва. Паваарот навукі да сацыялістычнага будаўніцтва, яе далейшае разьвіцьцё магчымы толькі ў непрымірымай барацьбе з ухіламі ад бальшавізму, з усялякімі спробамі рэвізаваць марксізм, магчымы пры барацьбе на два фронты, супроць паўзучага эмпірызму і адрыву навукі ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва. Шпаркія тэмпы ў разьвіцьці навукі магчымы толькі пры шырокім скарыстаньні навуковай спадчыны Маркса, Энгельса, Леніна, пры глыбокім вывучэньні работ т. Сталіна, правадыра і тэарэтыка нашай партыі, пры рашучым укараненьні марксызму - ленінізму ва ўсе галіны навукі.

У справе ўзвязкі разьвіцьця навукі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва надзвычай вялікую ролю адыгрывае выпрацоўка тэматыкі навукова-дасьледчай работы. Адпраўным пунктам пры складаньні тэматыкі навукова-дасьледчай работы, зусім ясна, павінны быць тыя ўстаноўкі і задачы, якія партыя ставіць у другой пяцігодцы ў справе зазярнаньня рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі і пабудовы бясклясавага грамадзтва. Зразумела, што выпрацоўка тэматыкі навукова - дасьледчай работы ў другой пяцігодцы — справа надзвычай вялікая і адказная. Яна патрабуе шырокага ўдзелу ў ёй навуковых кадраў, патрабуе, каб усе навуковыя ўстановы ў самыя бліжэйшыя месяцы дазгарнулі работу па складаньні сваіх пяцігадовых плянаў, увязваючы іх плянамі разьвіцьця ўсёй народнай гаспадаркі БССР.

Вышэй ужо мы падкрэсьлілі ролю вялізарнай тэорыі ў барацьбе за сацыялізм, вялікае значэньне грамадзкіх навук. Перад грамадзкімі навукамі зараз высоўваецца цэлы рад праблем, ад правільнага вырашэньня якіх залежыць пасьпяховае выкананьне другой пяцігодкі. Кожнаму добра вядома, што ўсякая памылка ў тэорыі няўхільна пагражае дрэннымі рэзультатамі на практыцы. І на самой справе, ці здольны мы будзем вырашыць задачы другой пяцігодкі, калі не дамо бальшавіцкай распрацоўкі пытаньня аб дыялектыцы пабудовы бясклясавага грамадзтва. Наша філёзофская думка на аснове вывучэньня ленінскай спадчыны павінна будзе гэту праблему зрабіць адпраўным пунктам у сваёй рабоце.

Без гэтага нельга весьці рашучую барацьбу супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі на даным этапе, нельга выкрываць сутнасьці контр-рэвалюцыйнага трацкізму, нельга весьці барацьбу супроць «левых» загібаў і прымірэнцаў да ўхілаў ад бальшавізму. Без гэтага нельга весьці далейшую тэарэтычную распрацоўку такіх пытаньняў, як зьнішчэньне рэштак капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, як ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, як зьнішчэньне пропілегласьці паміж горадам і вёскай, як вывучэньне рэштак буржуазнага права ў першай фазе камунізму і г. д.

Надзвычай адказныя задачы ў другой пяцігодцы стаіць і перад работнікамі галіны права і дзяржавы. У сувязі з тым, што партыя паставіла задачу ў другой пяцігодцы пабудаваць бясклясавае грамадзтва, з боку асобных работнікаў можна чуць гутаркі аб ліквідацыі пралетарскай дзяржавы. Зусім ясна, што **такія разважаньні нічога агульнага ня маюць з бальшавізмам.**

Гутаркі і настроі аб ліквідацыі дзяржавы з усёй сілай выяўляюць неразуменьне радам таварышоў дыялектыкі разьвіцьця пралетарскай дзяржавы. Накопт адміраньня дзяржавы **т. Сталін** выразна сказаў: «Мы за адміраньне дзяржавы і мы разам з тым стаім за ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту, якая прадстаўляе самую моцную і самую магутную ўладу з усіх дзяржаўных улад, якія да гэтага часу існавалі. Вышэйшае разьвіцьцё дзяржаўнай улады ў мэтах падрыхтоўкі ўмоў для адміраньня дзяржаўнай улады — вось марксыцкая формула. Гэта супярэчліва? Так, супярэчліва. Але супярэчнасьць гэта жыцьцёвая і яна цалкам адлюстроўвае марксаву дыялектыку».

Толькі па-бальшавіцку разумеючы дыялектычнае разьвіцьцё дыктатуры пралетарыяту, мы здолеем правільна вырашыць тыя пытаньні, што стаіць перад нашымі прававікамі.

У сваім лісьце ў рэдакцыю «Пролетарская революция» **тав. Сталін** паставіў пытаньне аб значэньні бальшавіцкага вывучэньня гісторыі, у прыватнасьці, гісторыі нашай партыі.

Скарыстоўваючы тыя вялікія магчымасьці і пэрспэктывы, якія дае другая пяцігодка ў разьвіцьці гістарычных навук, трэба ні на хвіліну не забываць, што гэты вучастак, як і іншыя, зьяўляецца арэнай жорсткай клясавай барацьбы. Таму трэба **правяць максымум бальшавіцкай пільнасьці, весьці непрымірымае змаганьне з усялякімі наскокамі на бальшавіцкую рэвалюцыйную тэорыю.** У бліжэйшую пяцігодку неабходна падагуліць гераічнае змаганьне нашай партыі, а над яе кіраўніцтвам усяго пралетарыяту за Кастрычніцкую рэвалюцыю і сацыялістычнае грамадзтва.

Перад работнікамі эканамічнага фронту БССР побач з агульнымі пытаньнямі, якія стаіць перад эканамічнай думкай СССР (сацыялістычнае «воспроизводство» і накапленьне, вывучэньне пытаньня сяўгаснага і калгаснага будаўніцтва, вывучэньне пытаньня савецкага гандлю, ролі грошай у другой пяцігодцы, праблем вымярэньня працы і г. д.), паўстае цэлы рад важнейшых задач, без вырашэньня якіх мы ня здолеем рэалізаваць плян другой пяцігодкі. Эканамічная мысль БССР у значнай меры адстала ў пытаньнях разьвіцьця нашай прамысловасьці. Таму канкрэтная задача эканамістаў — у самы бліжэйшы час дасьледаваць БССР, даць поўнае манаграфічнае вывучэньне нашых раёнаў.

Да ліку важнейшых задач, што стаіць перад эканамічнай думкай БССР, трэба аднесьці і вывучэньне такой праблемы, як практычнае ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў т. **Сталіна** ў практыцы нашага прамысловага, калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, такіх пытаньняў, як формы размеркаваньня, спэцыялізацыі прамысловасьці БССР, сацыялістычнай рэканструкцыі гарадоў, разьвіцьця лясной гаспадаркі, вывучэньня праблемы скарыстаньня Дняпра, аналіз рэспубліканскага і мясцовага бюджэту і інш. Адно з важнейшых месц у рабоце нашых эканамістаў павінна заняць вывучэньне народна-гаспадарчага вучоту.

Уступаючы ў другую пяцігодку, гаворачы аб задачах, якія стаіць перад навуковай думкай БССР, трэба падкрэсьліць, што барацьба за далейшае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі ня толькі ня зьнімаецца ў другой пяцігодцы, а патрабуе да сябе значна большай увагі. Выкрываючы ўхіл да вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, ухілы да мясцовага нацыяналізму і шавінізмаў іншых колераў, мы павінны няўхільна разгортваць інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Выходзячы з пастаноў ЦК КП(б)Б мы павінны ўзмацніць нашу работу па вывучэньні і распрацоўцы пытаньня разьвіцьця беларускай мовы і іншых моваў нашай рэспублікі. Гэту работу трэба цесна ўвязаць з вывучэньнем мовы насельніцтва Заходняй Беларусі, што знаходзіцца пад акупацыяй польскага фашызму. Як канкрэтную задачу, мы павінны паставіць сабе выданьне на беларускай мове поўнага збору твораў **Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна.** Неабходна таксама ў бліжэйшы час практычна прыступіць да падрыхтоўкі выданьня беларускай энцыклёпэдыі. Разам з гэтым трэба забясьпечыць выданьне клясыкаў марксызму на іншых мовах нашай рэспублікі.

Другая пяцігодка адкрывае таксама вялізарныя пэрспэктывы разьвіцьця перад прыродазнаўчымі і тэхнічнымі навукамі. Дасьледваньне прыродных багацьцяў БССР, электрыфікацыі ў галіне хэміі, вывучэньня сельска-гаспадарчых культур і жывёлагадоўлі БССР, — вось найбольш важныя пытаньні, якія стаіць перад прыродазнаўчай і тэхнічнай навукамі. Зусім ясна, што навукова-дасьледчая работа на такіх вучастках як медыцына, арганізацыя працы і сацыялістычнага быту, будаўнічыя матар'ялы, гаспадарка і інш. павінна ісьці таксама больш узмоцненымі тэмпамі.

Вывучэньне і дасьледваньне прыродных багацьцяў БССР, у прыватнасьці геалёгічныя работы ў другой пяцігодцы, павінны атрымаць значна шырэйшыя размахі. Геалёгічныя і геамарфалёгічныя дасьледваньні, якія зараз адбываюцца ў асобных раёнах, павінны ахапіць усю БССР.

Ажыцьцяўленьне задачы стварэньня адзінай усесаюзнай высокавольтнай сеткі перад навукова-дасьледчай работай высоўвае цэлы рад праблем: акумуляцыя энэргіі, праблема перадачы, распрацоўка стандартных тыпаў станцый і г. д. У прыватнасьці, перад навуковымі работнікамі БССР стаіць задача выпрабаваньня ізаляцыйных матар'ялаў, якія ёсьць у Беларусі. Сур'ёзная праблемай для нашых энэргетыкаў зьяўляецца больш рацыянальнае скарыстаньне прамысловай электраэнэргіі і выпрацоўка пляну сельска-гаспадарчай электрыфікацыі. Асаблівая ўвага нашых дасьледчыкаў павінна быць накіравана на цёплафікацыю, якая мае выключнае значэньне для БССР, дзе прамысловая жывёлагадоўля адыгрывае вялікую ролю ў народнай гаспадарцы.

Побач з электрыфікацыяй, як вядучай галіной нашай народнай гаспадаркі, у цэнтры нашай увагі заўсёды трэба мець **хэмічную прамысловасьць.** Электрычнасьць і хэмія — база нашага сацыялістычнага разьвіцьця. Хэмія ня ведае такіх паняцьцяў, як адкіды і адыходы. Хэмія мае выключнае значэньне ў галіне сельскай гаспадаркі. Яна таксама мае рашаючае значэньне ў галіне тэкстыльнай, гумавой, лясной прамысловасьці. Яна ўносіць поўную рэвалюцыю ў нашу апалавую прамысловасьць. Мы ўжо не гаворым аб тым, што хэмічная прамысловасьць мае важнейшае значэньне ў павышэньні абароназдольнасьці нашай краіны.

Мы ва ўвесь рост павінны паставіць пытаньне аб вывучэньні хэмічных уласьцівасьцяй торфу, вывучыць пытаньне аб торфакаксаваньні, пытаньне ўкараненьня хэміі ў лесаапрацоўчую прамысловасьць і г. д.

Нарэшце, коратка спынімся на задачах прыродазнаўчых навук. Мы слабаведаем ня толькі выкапні БССР, але і невыстарчальна вывучылі нашу фёру і фаўну. Таму нашай бліжэйшай задачай зьяўляецца падрабязнае і глыбокае геабатанічнае вывучэньне БССР. У другой пяцігодцы мы павінны дабіцца разьвядзеньня новых сельска-гаспадарчых культур у БССР. Вопыты з разьвядзеньнем соі ў БССР далі станоўчыя выпікі. Ёсьць усе падставы меркаваць, што кліматычныя ўмовы БССР дазволяць культываваць цэлы рад новых культур, якія раней тут не разводзіліся. Экспэрыментатарская работа па разьвядзеньні новых культур павінна прыцягнуць да сябе самую вялікую ўвагу ня толькі навукова-дасьледчых устаноў, але і саўгасаў і калгасаў.

У цэнтры нашай увагі павінна быць таксама вывучэньне розных народ жывёлы. Шпаркае разьвіцьцё жывёлагадоўлі патрабуе паляпшэньня пастаноўкі навукова-дасьледчай работы ў галіне вэтэрынарыі.

У гэтым разьдзеле мы закранулі толькі нязначную частку тых пытаньняў, над якімі нам прыдзецца працаваць у другой пяцігодцы.

***

Забесьпячэньне высокіх тэмпаў у разгортваньні навукова-дасьледчай работы, як мы ўжо падкрэсьлівалі, залежаць ад паваароту яе да практыкі сацыялістычнага будаўніцтва, ад выразнага разуменьня таго, што навуковы фронт зьяўляецца арэнай клясавай барацьбы, ад разуменьня таго, што мы зможам атрымаць новыя перамогі толькі ў барацьбе за партыйнасьць навукі. У сувязі з гэтым мы з усёй вострасьцю павінны паставіць пытаньне аб павышэньні якасьці нашай работы, аб пашырэньні нашых ведаў. У пастановах XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі падкрэсьлена, што **«колькасны рост тэхнічных кадраў у Савецкім Саюзе ні ў якай меры не павінен памяншаць значэньня іх навуковай кваліфікацыі, абавязковасьці адпаведнага ўсвоеньня імі ўсіх асноўных дасягненьняў сусьветнай навукі і тэхнікі».** Гэта адносіцца да ўсіх без выключэньня навукова - дасьледчых кадраў.

Другім сур'ёзным пытаньнем зьяўляецца падрыхтоўка новых пралетарскіх навуковых кадраў. Тав. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў указаў, што «нам неабходна зараз забясьпечыць сябе ў тры разы больш, у пяць раз больш інжынэрна-тэхнічнымі і камандным сіламі прамысловасьці, калі мы ...ску сацыялістычнай індустрыялізацыі СССР». Гэта палажэньне цалкам датычыць навуковых работнікаў. У бягучым годзе папярэднія падлікі паказваюць, што нам у БССР не хапае каля 500 навуковых работнікаў ва ўсіх навукова-дасьледчых установах. Гэты недахват навуковых сіл мы адчуем яшчэ больш востра ў будучым, калі з усёй сур'ёзнасьцю не адносемся да падрыхтоўкі навуковых работнікаў, не прыкуем да гэтай справы ўвагі грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый.

Адначасова з гэтым трэба ўмела скарыстаць старых беспартыйных вучоных. Нічога агульнага з бальшавізмам ня мае той погляд, што кожны беспартыйны вучоны патэнцыяльна шкодзік і контр-рэвалюцыянэр. Прапас прампартыі паказаў, што шкодніцтва захапіла толькі частку былой буржуазнай інтэлігенцыі. Асноўная-ж маса беспартыйнай інтэлігенцыі цесна зьвязала свой лёс з пралетарыятам і прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніц

А. МЭЕЗІТ

БОЛЬШ КАНКРЭТНАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ Ў РАБОЦЕ ВАЙСКОВЫХ ГРАМАДЗЯНСКІХ ЯЧЭЕК АСОАВІЯХІМУ

Зараз, калі работа ячэек Асоавіяхіму павінна быць паднята на ступень вышэй, калі тэмпы і якасьць павінны ператварыць гэту арганізацыю ў **апраўдны рэзэрв рабоча-сялянскай Чырвонай арміі**, шэфства і ўзаемная повязь паміж грамадзянскімі і ваеннымі ячэйкамі Асоавіяхіму набывае сёньні важнае значэньне.

Палітычная і, асабліва, міжнародная абстаноўка вымагаюць асабліва важлівых адносін да пытаньняў абароны. Капіталізм з катастрафічным крызісам усёй сваёй гаспадарчай сыстэмы «ўпаўзае ў вайну» бяз усякіх ганяроджаньняў і нават фактычна вяручы яе, як гэта было і ёсьць у Кітаі, ня прыхае яе існаваньня.

Разам з тым капіталізм рыхтуецца да вайны, і «ўпаўзае» ў яе з усімі навейшымі тэхнічнымі ўдасканаленьнямі і выпаходзтвамі ў справе ваеннай тэхнікі. Адсюль ускладняецца і барацьба з гэтай тэхнікай. Таму, зразумела, якую актуальнасьць набывае пытаньне тэхнічнай рэканструкцыі нашай Чырвонай арміі.

Падрыхтоўваючы ў такіх умовах рэзэрв Чырвонай арміі праз грамадзянскую арганізацыю, мы павінны максымальна выкарыстаць нашы шэфскія формы для ўзаемнай дапамогі ў галявой падрыхтоўцы.

У даны момант такога шэфства ячэек у большасьці выпадкаў фактычна ня існуе. Часта адсутнічае гражданская сувязь у рабоце, у культурным абслугоўваньні, у штодзённым кыцьці. Нярэдка сутаварыскія арганізацыі бяруць чалавека-двух і насылаюць іх адзін да другога. Масавая-ж сувязь, жывая работа на пытаньнях абароны не праводзіцца.

Між тым, зараз з наступленьнем лета, калі вайсковая вучоба грамадзянскіх арганізацый, таксама як і ваенных, выносіцца ў поле, **вайсковыя ячэйкі абавязаны дапамагчы наладзіць летнія формы работы.** Дзьве вайсковыя ячэйкі могуць спаборнічаць — якая больш арганізуе заняткаў і г. д. Пленум ЦС Асоавіяхіму паставіў задачу, каб вайсковыя ячэйкі (іменна ячэйкі) больш працавалі і рэальна дапамагалі грамадзянскім ячэйкам. **Разгарнуць вайскова-тэхнічную прапаганду, паказаць як працаваць, пасылаць дакладчыкаў, лектароў па канкрэтных пытаньнях у даны рабочы калектыў, клюб, цэх. Правесьці гутаркі па канкрэтных відах тэхнікі. Паставіць стралковую работу.**

Можна рэкамандаваць **арганізацыю кароткатэрміновых гурткоў** на 3-4 заняткі па пляну па канкрэтных тэмах. Тут асабліва могуць быць выкарыстаны прадстаўнікі спэцчасьцей. Штабы ячэйкі павінны забясьпечыць кіраўніцтвам дапамогу раёну. Неабходна мець кадры для вайскова-тэхнічнай прапаганды, трымаць іх на вучоце і па меры патрэбы скарыстоўваць. Такім чынам, **армейскія ячэйкі могуць весьці вайсковую работу і вайскова-тэхнічную прапаганду.** Падрыхтоўка кадраў Асоавіяхіму з **адпускнікоў** у грамадзянкім парадку таксама павінна вявіцца адной з практычных задач. Асаблівую дапамогу трэба аказаць прадпрыемствам, якія ператвараюцца ў «завод — крэпасьць абароны». Тут трэба вызначыць спэцыяльныя брыгады, якім там пасталяна працаваць.

Карысна арганізаваць **сустрэчу старых і будучых байцоў — прызыўнікоў** на прадпрыемстве, у калгасе, саўгасе, удзел начскладу і радавых байцоў наогул ва ўсёй рабоце Асоавіяхіму. Зараз, у часе лягерных зборай, запрашаць падшэфнікаў ня толькі на адкрыцьцё лягераў, але **прыцягваць і на вучэньні, манэўры.** Тут могуць прымаць удзел і рабочыя заводаў, фабрык, саўгасаў і калгасьнікі ў раёне заняткаў. Але трэба ставіць задачу «ня проста» «глядзець», а чаму-небудзь кожны раз навучыць. Гэта можна правесьці і здалёк ад лягеру.

Экскурсіі і сумесны турызм прыпчапляюцца слаба. А гэта зьяўляецца добрай вайскова - выхаваўчай базай.

У калгасах і саўгасах можа быць праведзена **масавая вайскова - тэхнічная прапаганда** ў палітасьветустановах (гутаркі, даклады), але таксама на канкрэтных тэмах і на прыкладах, зразумелых для ўсіх, на канкрэтным фоне міжнароднай абстаноўкі і задачах пралетарыяту і калгасьнікаў.

Заняткі і тут могуць быць праведзены, таксама як на вытворчых ячэйках. Ячэйкам, у якіх няма **навучальнага пункту,** рэкамандуецца форма вучобы — **навучальна - страявыя адзінкі.**

Калгасьнікаў і саўгасьнікаў трэба практычна навучыць, як **зьберагаць конскі склад, с.-г. тэхніку.** Дапамагчы паказам, а не расказам. Аказаць дапамогу ў забесьпячэньні літаратурай, дапаможнікамі па вайсковай вучобе.

Але гэта пакуль толькі адзін бок шэфства. Трэба адначасова культываваць і другі. **Ячэйкі Асоавіяхіму павінны арганізаваць экскурсіі вайсковых ячэек на завод, у саўгас, калгас.** Арганізаваць сумеснае культабслугоўваньне з ваенным зьместам, з канкрэтным выпрацоўваньнем задач абароны, стралковымі і фізкультурнымі спаборніцтвамі і г. д.

Мэтазгодна зрабіць справаздачу ў чырвонаармейскай часьці аб выкананьні заводам, саўгасам, калгасам прамфінпляну, сяўбы і г. д. **«Толькі ўдарнік-энтузіяст сацыялістычнай будоўлі можа лічыцца сапраўдным актыўным членам Асоавіяхіму, можа быць варты гэтай ганаровай годнасьці»** — так пісала «Правда». **Кожны член Асоавіяхіму — ударнік вытворчасьці, кожны ўдарнік — актыўны член Асоавіяхіму.** Неабходна ў працэсе гэтага ўзаемнага шэфства павысіць і значымасьць членства і стварыць больш актыўную грамадзкасьць.

Узаемны абмен матар'яламі аб ударніках. У часьцях можна арганізаваць вітрыну ўдарніка падшэфнага прадпрыемства, саўгасу, калгасу. Наладзіць сацспаборніцтва па пытаньнях баявой падрыхтоўкі, вучобы падшэфнікаў, выкананьні прамфінпляну, уборачнай кампаніі. Культшэфства, культабслугоўваньне асьветнікамі, вузаўцамі, работнікамі мастацтва вайсковых часьцей.

Калгасныя і саўгасныя ячэйкі павінны праявіць самі сваю дзейнасьць пры манэўрах вайсковых часьцей, пры далёкіх выхадах іх з лягеру, шляхам дапамогі пры адводзе кватэр, арганізацыі бівуаку і г. д.

Усё гэта патрабуе кіраўніцтва і ўвагі з боку партарганізацый, раённых саветаў Асоавіяхіму.

ХУТЧЭЙ І ПОЎНАСЬЦЮ РАЗЬМЯСЬЦІЦЬ 9.166 ТРУСАМАТАК—

ЗАДАЧА СЫСТЭМЫ БЕЛКААПХАРЧУ

Больш самадзейнасьці і ініцыятывы

Разьвіцьцё трусагадоўлі можа і павінна стаць адным з важнейшых сродкаў хутчэйшага палепшэньня спажэньня рабочых мясам.

Хуткая размнажаемасьць трусоў пры невялікіх выдатках на ўтрыманьне і кармленьне іх дае магчымасьць шырока разгарнуць гэту справу і ўжо ў бліжэйшы час атрымаць сотні тон высакаякаснага мяса.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб разьвіцьці трусагадоўлі ў прамысловых раёнах Маскоўскай, Ленінградзкай і Іванава - Вазьнясенскай абласьцях падкрэсьліў, каб **«у справе арганізацыі трусагадоўчых гаспадарак не дапускаць бюракратычнай цэнтралізацыі, а разьвіваць яе на аснове самадзейнасьці заводзкіх арганізацый і максымальнага скарыстаньня ўсіх мясцовых рэсурсаў».**

Трусатнікі павінны арганізоўвацца пры заводах і фабрыках, пры ЗРК і сталовых, пры школах, дзіцячых дамох, больніцах і дамох адпачынку.

Трусагадоўля — справа новая і масавага вопыту яшчэ няма. Паўстае рад законных пытаньняў: як пабудаваць там трусатнік? Адкуль узяць матачны матар'ял? Чым і як трусоў карміць? Як весьці барацьбу з эпізоотыяй сярод трусоў? І г. д. і г. д.

У трусатніку стало ўкі жанта № 6 (Менск)

З мэтай памяжэньня канкрэтных крокаў у разьвіцьці трусагадоўлі пры ўстановах грамадзкага харчаваньня, рэдакцыяй «Зьвязды» і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня праведзена нарада загадчыкаў сталовых гор. Менску разам з прадстаўнікамі гарадзкіх і цэнтральных арганізацый. Па нарадзе з дакладаў прадстаўнікоў Белкаапхарчу і менскага трэсту грамадзкага харчаваньня высьвятліліся, што далей намячэньня плянаў, якія да рэчы, яшчэ ня спушчаны ў нізы, гэтыя арганізацыі амаль не пайшлі.

Белкаапхарч склаў плян, паводле якога ў бягучым годзе пры кожнай сталоўцы павінен быць трусатнік мінімум з 14 трусаматак. Менскі трэст паставіць яшчэ 100 матак, акрамя наяўных, у гаспадарцы віцебскага трэсту — 300 і гомельскага — 250. Выкананьне пляну да студзеня 1933 г. забясьпечыць пастаноўку пры сталовых Белкаапхарчу 9.166 матак і 1.425 самцоў і ў гаспадарках трэстаў —2.862 маткі і 412 самцоў. У бягучым годзе, такім чынам, можна будзе зьняць з адкорму 2.755 штук. Каб выкакаць гэты плян, трэба загатовіць толькі 3.410 трусаматак і 480 самцоў.

Менскі трэст мае ўжо гаспадарку, у якой ёсьць 175 матак, 90 самцоў і 450 штук маладняка. Аб гэтай гаспадарцы толькі гаварыў прадстаўнік трэсту, бо зусім ня было чым пахваліцца па арганізацыі трусатнікаў пры сталоўках. Менскі трэст абмежаваўся пакуль што арганізацыяй сваёй гаспадаркі і канкрэтна ні парадай ні паказам не дапамог сталоўкам арганізаваць трусатнікі.

Спрэчкі паказалі аб наяўнасьці недаацэнкі самадзейных трусагадоўчых гаспадарак, якія павінны быць арганізаваны пры кожнай сталоўцы кармамі трусагаспадарку? Удзельнікі нарады, як адзін, зусім правільна падкрэсьлілі, што разьвіваць самадзейную гаспадарку трэба выключна на ўласнай кармовай базе (засеў 1-2 гэктараў, адкіды сталовак, бацьвіньне, гальлё і інш.).

Прадстаўнік Белтушкатрэсту тав. **Ланге** паставіў перад загадчыкамі сталовак канкрэтную задачу: **сушыць хлебныя скарынкі, гэта лепшы канцэнтраваны корм.**

Абмеркаваўшы выклік «Камунаркі», нарада **далучылася** да прапаноў, якія высунуты ў гэтым выклику, паставіўшы канкрэтную задачу — **сталоўкі Менску павінны быць узорам барацьбы за трусагадоўлю. Пры кожнай сталоўцы — самадзейная трусагаспадарка.**

Прапановы нарады павінны быць падхоплены і ажыцьцёўлены ў кожнай сталоўцы. Трэба сьледаваць прыкладу работнікаў сталовай «Камунарка», 6-ай сталовай ТСТ чыгуначнікаў (Менск), хлебазаводу, якія сьледам за абавязацельствамі практычна прыступілі да работы, пабудаваўшы ўжо трусатнікі і ўкамплектаваўшы іх маткамі.

Тав. ПОЗЬНЯК—ударнік трусатніка заводу «Полымя рэвалюцыі».

Замацаваць дасягненьні сталоўкі заводу імя Молатава

Работа сталоўкі заводу імя Молатава ў апошні час значна палепшылася. ЗРК «Дрэваапрацоўшчык» дапамагае заводзкай сталоўцы разгортваць самазагатоўкі. У прымацаваныя раёны высхала 5 чалавек для правядзеньня (сыстэматычна) самазагатовак.

За апошні час закуплена 60 курыц і 1.600 яек. Сталоўка заводу заключыла дагавор з саўгасам «Чырвоны транспартнік» на дастаўку 76 літраў малака штодзённа. У выніку ўсяго гэтага значна палепшылася якасьць абедаў, павялічылася колькасьць абедаючых на 100 проц. Арганізуецца свая прыгарадная гаспадарка. Ёсьць 22 га зямлі. Ужо пасеялі бульбу, буракі і гуркі, да 10 чэрвеня пасеюць ячмень і пасадзяць капусту.

Пры сталоўцы ёсьць сьвінаадкормачны пункт. Але дрэнна, што дагэтуль сьвінарнік не ўкамплектаван маладняком. 22 сьвіньні, якія стаяць на пункце, ужо адкормлены і ў хуткім часе пайдуць на ўбой. Неабходна, каб адміністрацыя сталоўкі ў хутчэйшы час укамплектавала сьвінарнік маладняком.

Заводзкія арганізацыі і работнікі сталоўкі па-сапраўднаму ўзяліся за арганізацыю трусагадоўчай гаспадаркі. Шляхам разгортваньня трусагадоўлі, заводзкія арганізацыі будуць мець магчымасьць яшчэ больш палепшыць харчаваньне рабочых. Ужо сіламі ЗРК і адміністрацыі сталоўкі будуецца на заводзкай тэрыторыі трусатнік, які заўтра, пасьлязаўтра будзе скончаны. Агарод будзе ўзаны і засеяны аўсом для корму трусоў. Зараз на заводзе ёсьць 52 труса, якія пакуль што знаходзяцца ў хляве. Клетак не хапае, частка трусоў бегае па ўсім хляве. На сёньня ёсьць толькі 24 маткі, але ў бліжэйшыя дні гаспадарка будзе ўкамплектавана 100 трусаматкамі.

Сярод рабочых праводзіцца масавая работа па разгортваньні трусагадоўлі на даму.

Шматтыражка «Молатавец», уключыўшыся ў сталінскі паход, праводзіць работу сярод рабочых, шырока растлумачваючы значэньне трусагадоўлі. У газэце зьмешчана некалькі артыкулаў, якія даюць кансультацыю па аспоўных пытаньнях трусагадоўлі. Паказан вопыт асобных рабочых, якія ўжо разводзяць трусоў.

Сызук.



МЭХАНІЗАЦЫЯ ПАЛІЎКІ ВУЛІЦ МЕНСКУ

10 чэрвеня—зьлёт дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці

Стаць у першых калёнах барацьбітоў за аўладаньне подступамі да другой пяцігодкі—

ганаровая задача дэпутацкіх груп мэталяапрацоўчай прамысловасьці

Дэпутацкія групы--перадавыя змагары за тэхнічна-эканамічную незалежнасьць

Лёзунг тав. Сталіна «ТЭХНІКА Ў ПЭРЫЯД РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЫРАШАЕ УСЁ» ўзьняў рабочыя масы на бальшавіцкую барацьбу за аўладаньне тэхнікай. На заводах і фабрыках Саюзу разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае вывучэньне машын і варштатаў, на дасканалае веданьне працэсаў вытворчасьці. Высокае ўзьнялася хваля змаганьня за заваяваньне тэхнічна-эканамічнай незалежнасьці краіны.

Дэпутацкая група маскоўскага заводу **«ДЫНАМО»** першай паказала ўзорныя прыклады аўладаньня перадавой тэхнікай і выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе заводы Саюзу. Заклік дынамаўцаў падхапіла дэпутацкая група **ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА.** Яна зьвярнулася да ўсіх дэпутацкіх груп мэталяапрацоўчай прамысловасьці БССР з прапановай склікаць усебеларускі зьлёт. Ініцыятыва заводу імя Варашылава падтрымана радам мэталяапрацоўчых заводаў Беларусі. Прадпрыемствы ўступілі паміж сабой у сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае асваеньне тэхнікі, на бальшавіцкую барацьбу за колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну. Рабочыя-дэпутаты заводу імя Варашылава ў парадку падрыхтоўкі да зьлёту ўзялі шэфства над работай бюро рацыяналізацыі і дабіліся ажыцьцяўленьня раду каштоўных прапаноў, якія далі заводу дзесяткі тысяч рублёў эканоміі. Рабочыя дэпутаты заводу «Гомсельмаш» правярылі заяўкі на імпартнае абсталяваньне, каб максымальна скараціць іх за лік заказаў на савецкіх заводах.

На Віцебскіх заводах арганізаваліся спэцыяльныя гурткі па асваеньні тэхнікі складаных імпартных варштатаў. Вялікіх посьпехаў дабіўся калектыў акулярнай фабрыкі.

За апошні час нашы машына-будаўнічыя заводы асвоілі рад новых вытворчасьцяй: сіласарэзкі «Інтэрнацыянал» і канюшынасартоўкі на заводзе «Гомсельмаш», растворамяшалкі на заводзе «Пралетары» (Гомель), бульбяны камбайн на заводзе «Камунар» і інш.

Прэзыдыум ЦВК БССР ухваліў ініцыятыву дэпутацкай групы заводу імя Варашылава і пастанавіў склікаць НА 10 ЧЭРВЕНЯ ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталяапрацоўчай прамысловасьці. Пастанова ЦВК наглядна паказвае, што савецкі ўрад надае вялікае значэньне змаганьню дэпутацкіх груп за прамфінплян, за заваяваньне перадавой тэхнікі.

У зьлёце прымуць удзел дэпутацкія групы 16 мэталяапрацоўчых заводаў. На зьлёце павінны быць абгавораны важнейшыя пытаньні рэканструкцыі заводаў, максымальнага выкарыстаньня абсталяваньня, выкананьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, асваеньня перадавой тэхнікі, замены імпартнага абсталяваньня і інш.

Трэба сказаць, што нашы заводы ў маі пагоршылі сваю работу: завод «Камунар» за 20 дзён мая выканаў месячны прамфінплян на 52,7 проц., «Чырвоны мэталіст» — на 40,1 проц., «Пралетары» — на 42,6 проц., «Гомсельмаш» — на 43,6 проц., імя Варашылава — на 18,6 проц. і г. д.

Зьлёт павінен мабілізаваць масы рабочых мэталістаў на бальшавіцкае змаганьне за поўнае выкананьне пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, за заваяваньне подступаў да другой пяцігодкі.

Зьлёту трэба ўсебакова абгаварыць пытаньне аб арганізацыі на мэталяапрацоўчых заводах спэцыяльных уцільцэхаў і брыгад для вырабу з адкідаў вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня, бо павялічэньне выпуску тавараў шырокага спажываньня зьяўляецца рашаючай умовай разгортваньня савецкага і калгаснага гандлю і паляпшэньня рабочага снабжэньня.

Зьлёт паказу і мабілізацыі вопыту

У сувязі са скліканьнем усебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталязаводаў, у Менск прыбыла брыгада газэты «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» з 5 чалавек. Брыгада была прынята старшынёй ЦВК СССР і БССР тав. **А. Г. Чарвякоўым.** У гутарцы з брыгадай тав. Чарвякоў заявіў:

— Зьлёт прысьвечваецца барацьбе дэпутацкіх груп за тэхнічна-эканамічную незалежнасьць Саюзу, за аўладаньне перадавой тэхнікай, пытаньням выкананьня заказаў чорнай мэталургіі і таксама савецкай работы на прадпрыемствах. Амаль на ўсіх мэталяапрацоўчых заводах БССР вырабляецца абсталяваньне, якое раней увозілася з-за мяжы. Зьлёт набывае зусім выключнае гаспадарча - палітычнае значэньне.

Ён можа даць належны эфэкт толькі ў тым выпадку, калі ён будзе праведзен як **зьлёт паказу і мабілізацыі вопыту.** Кожная дэпутацкая група мэталяапрацоўчага заводу павінна прадэманстраваць перад зьлётам вопыт канкрэтнай работы ў якой-небудзь аднэй галіне, напрыклад, у галіне барацьбы за разгортваньне вынаходзтва, за эканомію мэталю, за рацыяналізацыю вытворчасьці і інш.

Мы запрасілі на зьлёт дэпутацкую групу маскоўскага заводу «Дынамо», ініцыятара паходу заводаў за тэхнічна-эканамічную незалежнасьць СССР. Трэба запрасіць на зьлёт таксама дэпутацкую групу аднаго з перадавых ленінградзкіх заводаў. У зьлёце павінны прыняць удзел рабочыя-ўдарнікі і спэцыялісты.

Тав. Чарвякоў адзначыў, што «Известия» хутка падхапілі ініцыятыву БССР і па-баявому ўключыліся ў падрыхтоўку гэтай вялікай справы, якая набывае ўсесаюзнае значэньне.

Заваёўваем вышыні перадавой тэхнікі

ВІЦЕБСК. Віцебская акулярная фабрыка мае ўсесаюзнае значэньне. Яна адзіная ў СССР вырабляе папераджальныя акуляры і расьпіратары. Акрамя таго, у прадукцыю фабрыкі ўваходзяць пэнснэ, звычайныя акуляры, аптычнае шкло і сеткі для камнядрабілак.

Яшчэ два-тры гады назад акулярная фабрыка амаль на 80 проц. залежыла ў тэхнічных адносінах ад заграніцы. Вінты, шайбы, прыгонкі і розны дапаможны матар'ял імпартаваліся з капіталістычных краін. Паступова разгортваючы вытворчасьць, рабочы калектыў фабрыкі крок за крокам заваёўваў незалежнасьць. Больш 250 чалавек рабочых, ахопленых тэхнічнымі гурткамі і 50 — курсамі па падрыхтоўцы цэхавага адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, з галавой акунуліся ў вывучэньне тэхнікі.

Рацыяналізатарская работа была цесна ўвязана з дзейнасьцю вытворчых нарад. Дзякуючы сыстэматычнаму правядзеньню нарад па групах і зьменах, амаль увесь калектыў фабрыкі быў уцягнут у барацьбу за аўладаньне перадавой тэхнікай.

Токар **Легдзін,** загадчык зборачнага цэху **Гарадзецкі,** канструктар **Арш** унесьлі прапанову аб вырабе ўсяго дапаможнага матар'ялу на фабрыцы. Зараз дапаможны матар'ял больш на ўвозіцца з-за мяжы. Гэтыя-ж т. т. разам з тэхнікам **Кулібанавым,** сьлесарамі **Бязьлюдавым, Барткевічам, Алейнічэнка** дабіліся вырабу на фабрыцы штампаў да акуляраў «фітцу» і «бакінбрыль». Раней гэтыя штампы ўвозіліся з-за мяжы. Канструктар тав. **Арш** зрабіў спэцыяльнае прыстасаваньне для выкалкі круглых фармовачных чашак па такарных варштатах. Выробленая на фабрыцы чашка каштуе 30 руб. і па сваёй якасьці ня ўступае замежнай, якая каштавала 300 руб. Гэта мерапрыемства дало 3.900 руб. эканоміі ў год.

Вялікая работа праведзена тэхнэрсаналам фабрыкі, пад кіраўніцтвам інжынэра **Вінтэра,** па зьнішчэньні масавага браку ў часе шліфоўкі і паліроўкі шкла да акуляраў № 1950. Брак з 90 проц. зьніжан да 3,5 проц., што дае фабрыцы 1.400 руб. эканоміі ў год.

Высока ўзьняўся творчы энтузіязм рабочых мас. Ён знаходзіць сваё адлюстраваньне ў росьце каштоўных рабочых прапаноў. За чатыры месяцы

Група рабочых-рацыяналізатараў віцебскай акулярнай фабрыкі

гэтага году паступіла 164 прапановы, з якіх прыняты 102, ажыцьцёўлены 74.

Дзякуючы ўвядзеньню новых працэсаў вытворчасьці, аўладаньню тэхнікай замежнага абсталяваньня, заяўка фабрыкі на імпарт скарочана з 10 тыс. руб. золатам да 1.150.

Рабочы калектыў фабрыкі, пад кіраўніцтвам партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі, па-бальшавіцку змагаецца за выкананьне вытворчай праграмы. Калі прамфінплян 1931 г. быў выкапан толькі на 65,8 проц., дык першы квартал гэтага году даў выкананьне праграмы на 101,3 проц., красавік — на 111,4 проц., 20 дзён мая — на 108,4 проц.

Арк. Зарубежны.

Старобінская партарганізацыя ў барацьбе за веснавую сяўбу

Старобінскі раён на 25 мая выканаў 65,6 проц. пасеўнага пляну і заняў на чырвоную дошку кандыдатаў на прэміяваньне ў абвешчаным Наркамземам БССР конкурсе. Посьпехі раёну заключаюцца ў тым, што партыйнае кіраўніцтва Старобінскага раёну здолела высока ўзьняць баяздольнасьць усёй партарганізацыі ў барацьбе за рэалізацыю асноўных задач партыі.

Падрыхтоўку да веснавой сяўбы Старобінская партарганізацыя распачала яшчэ з уборачнай кампаніі мінулага году. Уменьне партарганізацыі зьвязаць усе гаспадарча - палітычныя кампаніі, якія праводзяцца на вёсцы, у адну вялікую работу да арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў—вось, што выразьнела посьпехам у падрыхтоўцы і правядзеньні сяўбы.

Партыйнае кіраўніцтва Старобінскага раёну зьвярнула асаблівую ўвагу на вывучэньне свайго раёну, дакладна ведае кожны калгас, яго магчымасьці і слабыя месцы. Гэта спрыяла ажыцьцяўленьню апэрацыйнага канкрэтнага кіраўніцтва кожнай ячэйкай, калгасам, сельсаветам.

Цэнтральнае месца ў падрыхтоўцы веснавой сяўбы заняла работа па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Райком зусім правільна лічыў, што тут працаздольнасьць райкалгассаюзу мае надзвычай важнае значэньне і паклаў на ўмацаваньне яго апарату групу лепшых таварышоў камуністаў. На самачыстку калгасаў ад кулацка-варожых элемэнтаў, на окладаньне вытворча - фінансавых планаў і выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб калгаснай брыгадзе, праз партыйныя ячэйкі і раённы актыў была ўзьнята ўся калгасная маса. У выніку — з 73 калгасаў 72 маюць вытворча-фінансавыя пляны пабрыгадна. Праўда, ёсьць калгасы, дзе яшчэ не зразумелі ўсёй арганізуючай ролі брыгады, аднак, у большасьці брыгада цяпер у веснавую сяўбу стала цэнтрам барацьбы за сяўбу і павышэньне ўраджайнасьці.

На падставе разгорнутай масавай **работы сярод калгасьнікаў** была забясьпечана на аснове поўнай добраахвотнасьці аграмаджаньне азімых і яравых пасеваў і калектыўнае адлічэньне пасенных фондаў у 67 калгасах. Гэта забясьпечыла стварэньне калгасных пасенных фондаў. Арганізацыяй унутрыкалгаснай і міжкалгаснай узаемадапамогі амаль поўнасьцю пакрыт недахват пасеньня ў слабейшых калгасах.

З вясны ў раёне ўступіла ў строй МТС з лікам 15 трактараў, аднак, асноўнай цягавай сілай усё-ж застаецца конь. Ад яго ў значнай меры залежыць посьпех пасоўнай. Гэта сваячасова ўлічыў раённы камітэт партыі і з 16 сьнежня праз сваю газэту **«Калгасьнік Старобіншчыны»** абвясьціў двухдэкаднік цягавай сілы, праверкі становішча догляду коняй. «Калгасьнік Старобіншчыны» жорстка б'е на кулацкіх тэндэнцыях у паасобных калгасах — збыць, або зьнішчыць кагасаў. Газэта паказвае на бестаспадарняй. Газэта паказвае на бестаспадарчыя адносіны да коняй у калгасах: «Чырвоная Дуброва», «Чырвоны Пуцілавец», «1 мая», «Палескі штэрн» і інш., разам з гэтым яна паказвае канкрэтныя шляхі захаваньня коняй.

З дня ў дзень райком правяраў падрыхтаванасьць да сяўбы паасобных сельсаветаў і калгасаў і сваімі брыгадамі падцягваў адзін за другім адстаючы вучастак. У падрыхтоўцы сяўбы выявіліся новыя дзесяткі актыву калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. Яны дапамагаюць арганізацыі падцягваць адстаўшых, сыгналізуюць аб слабых мясцох.

Вялізарную ролю ў правядзеньні сяўбы адыгралі насьценныя газэты. Звыш 80 газэт былі пастаўлены па ноч. Газэта калгасу **«Чырвоны хлебароб»** у сувязі з падрыхтоўкай да сяўбы яшчэ з 1 лютага перайшла на штодзённку. За бю рад іншых сталі выходзіць штодзённкамі і трохдзённкамі. Зразумела, што не самацёкам узьнікла звыш 80 насьценных газэт і каля 300 рабселькораў. Райкомам партыі і раённай газэтай былі сваячасова праведзены два масавыя раённыя зьлёты і тры спэцыялізаваныя зьлёты рабселькораў у 23 пунктах раёну.

Старобінскі раён калектывізаваны на 40 проц. Яшчэ больш паловы сялянскіх гаспадарак праводзяць веснавую сяўбу аднаасобнікамі. Аднак, некаторыя работнікі на месцы выпускалі гэта з поля гледжаньня і ўсю ўвагу накіроўвалі на падрыхтоўку да сяўбы толькі калгасаў. Старобінская партарганізацыя сваячасова ўлічыла гэты недахоп. «Калгасьнік Старобіншчыны» ўжо з сакавіка пачынае сыстэматычна асьвятляць падрыхтаванасьць паасобных паселішчаў. «Аднаасобнікі в. Піваны не павінны адставаць» — гаворыць газэта і бярэ вёску на сацыялістычны буксір. Зьмяшчаюцца зводкі засьпікі страхавых фондаў, ачыстка насьценьня, збору попелу і рамонту с.-г. інвэнтару на аднаасобным сэктары. Праз сельскі актыў выяўляюцца гаспадаркі, у якіх не хапае насьценьня, і бяднейшай частцы аказваецца дапамога. Сваячасова адводзіцца зямля ўсім аднаасобнікам, праводзяцца масавыя сходы па вёсках. Прарыў быў ліквідаваны і аднаасобнікі ўвайшлі ў сяўбу падрыхтаванымі.

9 сакавіка РК КП(б)Б, райпрафсавет і райкалгассаюз праводзяць масавы зьлёт ударнікаў калгасаў і саўгасаў, на якім завастраецца ўвага на мерапрыемствах па падрыхтоўцы да сяўбы і па аўладаньні агратэхнікай. За ім праводзіцца спэцыяльны зьлёт жанчын-ударніц — калгасьніц з удзелам аднаасобнікаў. З посьпехам прайшлі раённыя канфэрэнцыі былых чырвоных партызан, старшага, сярэдняга і малодшага начскладу РСЧА. Рад калгасьнікаў і аднаасобнікаў узялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па правядзеньні веснавой сяўбы і павышэньні ўраджайнасьці. А ўжо 10 сакавіка рапартуюць партыі аб сваёй гатоўнасьці да сяўбы калгасы **«Колас» і «Чырвоная мяжа»,** 15 сакавіка калгасы **«Чырвоны пагранічнік», «Працаўнік», «Расьсьвет» і інш.**

13 красавіка перадавыя калгасы выйшлі ў поле. У гэты дзень калгас **«Камунар»** засеяў 4 гэкт., **«Новы шлях»** — 3,5 гэкт., **«Расьсьвет»** і **«Камінтэрн»** праводзілі ворыва. Штаб акрэсьліў поўную гатоўнасьць да сяўбы Лістападаўскага савету. З 24 красавіка разгарнулася масавая сяўба па ўсім раёне. Выхад у поле выклікаў новую хвалю энтузіязму сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў. На сходах, мітынгах калгасныя брыгады і калгасы ў цэлым абвінчалі сябе ўдарнікамі і выклікалі на сацспаборніцтва суседнія калгасы і вёскі.

Старобінскі раён на самай мяжы. Рад калгасных вёсак знаходзіцца за некалькі мэтраў ад задушаных ботам полескага пана вёсак Заходняй Беларусі. Тут клясавы вораг рабіў найманейшыя атакі на калгасы. Аднак, гэтыя атакі былі адбіты ўпартай работай партыйнай арганізацыі па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў і палітычным выхаваньнем мас.

Пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа- і жывёлазагатоўках, а таксама закон аб с.-г. падатку сваячасова шырока прапрацаваны на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў, што выклікала новы ўздым энтузіязму. Рад калгасаў і паселішчаў датэрмінова выканалі пасеўны плян і выступілі з сустрэчным.

Няправільна было-б, гаварыць аб посьпехах, не заўважыць недахопаў у правядзеньні сяўбы. Яны ёсьць і ў некаторых з іх крыецца пагроза зрыву сяўбы на паасобных вучастках. Няпоўнасьцю забясьпечаны калгасы насьеньнем канапель, у некаторых калгасах разбазарваецца і скармліваецца пасенная бульба, дрэнна арганізаван догляд коняй і інш. У некаторых таварышоў заўважваецца «галавакружэньне ад посьпехаў», калі за першымі посьпехамі пакідаюць па-за ўвагай дробныя недахопы і непаладкі, якіх потым цяжка будзе ўнікнуць. Гэта з усёй сур'ёзнасьцю павінна ўлічыць раённае партыкіраўніцтва. Трэба рашуча пакончыць са спробамі кулакоў і заможнікаў ухіліцца ад выкананьня заданьняў.

Старобінскі раён спаборнічае з Чырвона-Слабодзкім і адстае ад апошняга ў тэмпах сяўбы. Гэта павінна прымусіць партарганізацыю Старобіншчыны зрабіць яшчэ большае намаганьне, яшчэ вышэй узьняць сьцяг барацьбы за поўнае выкананьне пляну ў вызначаныя тэрміны.

К. Веранейчык.

У БССР БУДУЮЦЦА ТЫСЯЧЫ РОЗНЫХ ШКОЛ

уведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне, ліквідуецца няпісьменнасьць

У ЗАХ. БЕЛАРУСІ АКУПАНТЫ ЛІКВІДУЮЦЬ РЭШТКІ БЕЛАРУСКАГА ШКОЛЬНІЦТВА

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРАТЭСТУ СТУДЭНТАЎ МЕНСКАГА БЕЛАРУСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ТЭХНІКУМУ

Мы, **пэўтысячнае чырвонапралетарскае студэнцтва і настаўніцтва Менбелпедтэхнікуму** з абурэньнем пратэстуем супроць паходу польскага фашызму на нацыянал-вызваленчы рух працоўных Зах. Беларусі, ліквідацыі ТБШ і беларускага школьніцтва.

У той час, калі Савецкі саюз заканчвае першую пяцігодку, з посьпехам будуе сацыялізм, калі СССР стаіць на парозе другой пяцігодкі—пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, а ў БССР будуюцца дзесяткі і сотні розных школ, зусім ліквідуецца няпісьменнасьць, расьце дабрабыт шырокіх працоўных мас, у гэты час на той бок мяжы, **у Зах. Беларусі польскія імпэрыялісты - акупанты пры дапамозе сваіх верных лёкаяў—беларускіх нацыянал-фашыстаў Астроўскага, Луцкевіча, Акінчыца, К° душаць усе праяўленьні нацыянальна-вызваленчага руху і ліквідуюць беларускае, літоўскае і ўкраінскае школьніцтва.**

Ліквідаваўшы 100-тысячную беларускую сялянска-работніцкую Грамаду, «Змаганьне» і сотні беларускіх школ, кінуўшы за краты лепшых барацьбітоў за правы працоўных, акупанцкі ўрад падрыхтоўвае ліквідацыю ТБШ і апошніх 2-х беларускіх гімназій—у Вільні і Навагрудку. Акупанты імкнуцца шляхам разгрому рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху і яго арганізацый, падрыхтаваць плацдарм для будучай вайны супроць СССР.

Мы заяўляем: даремна! Ня ўдасца вам, подлыя імпэрыялістычныя «цывілізатары», задушыць рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух у Зах. Беларусі. Працоўныя масы ў адказ на крывавы тэрор, па ваенна-палявыя суды і лес шыбеніц, па нацыянальны ўціск яшчэ шчыльней згуртуюцца вакол гераічнай КПЗБ і для рашаючага бою за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры.

Мы, чырвонае пралетарскае студэнцтва, зварачаемся да ўсёй студэнцкай моладзі БССР і СССР, да ўсіх рабочых і калгасьнікаў яшчэ вышэй узьняць голас пратэсту супроць крывавага паходу польскіх акупантаў на рэвалюцыйна-вызваленчы рух ЗБ, супроць ліквідацыі ТБШ і рэшткі беларускага школьніцтва.

Мы, катэгарычна дамагаемся зваленьня з турмаў лепшых барацьбітоў працоўных мас ЗБ т. т. **Тарашкевіча, Валошына, Дварчаніна, Гаўрыліка, Крынчыка і ўсіх палітзьняволеных рабочых і сялян.**

У адказ крывавым «пацыфікатарам», мы абавязваемся, як найхутчэй аўладаць асновамі навук, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, узьняць вышэй клясавую пільнасьць, узмацніць інтэрнацыянальную працу і ўсім уступіць у рады МОПР'у.

Прэч рукі ад ТБШ і беларускага школьніцтва!

Далоў здраднікаў і праваканатараў беларускіх нацылнал - фашыстаў Астроўскага, Луцкевіча і К°!

Далоў акупантаў Зах. Беларусі!

Няхай жыве і магутнее нацыянальна-вызваленчы рух працоўных мас ЗБ!

Няхай жывуць загартаваныя ў штодзенных баёх за справу працоўных мас—КПЗБ і КСМ ЗБ!

ФАШЫСТ ГАРГУЛАЎ ЗАБІЎ ДУМЭРА СУПОЛЬНА З ПАРЫСКІМІ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАМІ

Новыя спробы зрабіць Гаргулава „бальшавіком"

ПАРЫЖ, 31. Сьледзтва па справе Гаргулава зноў прабуе вярнуцца да першай «вэрсіі» аб Гаргулаве, як аб «бальшавіку». Пасьля правалаў паказаньняў розных, накшталт Астахава, белагвардзейскіх сьведкаў і інш. «сьведак», француская паліцыя і сьледчыя ўлады, ня маючы відавочна покуль «новых сьведкаў», спэцыяльна выклікалі ў Парыж казака Лазарава для вочнай стаўкі з Гаргулавым. Казак Лазараў, які жыве цяпер у Тарбэ, паведаміў 15 мая ў лісьце данскому атаману генэралу Багаеўскаму, што «па здымках Гаргулава, апублікаваных у францускіх газэтах ён пазнаў чэкіста з Растова». Судзьдзя-сьледчы Фужэры камандураваў тады ў Тарбэ паліцэйскага інспэктара Мэна, які паказаў Лазараву 10 здымкаў Гаргулава. Лазараў на гэтых здымках не пазнаў Гаргулава. У сувязі з гэтым судзьдзя-сьледчы Фужэры адмовіўся прызнаць «каштоўнасьць» паказаньняў Лазарава.

Цяпер высьвятляецца, што потым Лазараў прыслаў судзьдзі-сьледчаму новы ліст «з падрабязнасьцямі» аб Гаргулаве, пасьля чаго Фужэры выклікаў Лазарава ў Парыж. Лазараў заявіў судзьдзі-сьледчаму, што «камісар Мэн не зразумеў яго, інакш ён даказаў-бы яму, што ён ведае Гаргулава».

Француская прэса падае падрабязнасьці вочнай стаўкі паміж Гаргулавым і Лазаравым. Лазарава ўвялі ў пусты габінэт судзьдзі-сьледчага. У гэты час Гаргулаў знаходзіўся ў суседнім пакоі. Лазараў, пачуўшы голас Гаргулава праз напоўадчыненыя дзьверы нібы ўздрыгнуў і закрычаў: «Гэта ён Гаргулаў». Потым Гаргулаў быў уведзен у суправаджэньні 7 інспэктароў паліцыі і абаронцы ў габінэт Фужэра і тут Лазараў—на вялікую радасьць правай прэсы—прызнаў у ім «чэкіста з Растова». Аднак, «Пары мідзі» прымушана падкрэсьліць: «Той факт, што Лазараў адразу-ж пазнаў Гаргулава сярод інспэктароў паліцыі, якія ўвялі яго ў пакой да судзьдзі-сьледчага, яшчэ не даказвае нічога, бо ў газэтах было даволі здымкаў Гаргулава, каб хто ўгод на мог гэта зрабіць».

Гаргулаў, выслухаўшы заяву Лазарава ўскрыкнуў: **«Ён п'яны, ён алкаголік, дэгенэрат, слабавумны выродак. Вы самі бачыце, што ў яго ад п'яства вум за розум зайшоў».** Пасьля вочнай стаўкі судзьдзя-сьледчы Фужэры, па просьбе абаронцы Жэро яшчэ раз запытаў Гаргулава аб матывах злачынства. Гаргулаў і на гэты раз паўтарыў тое, што ён гаварыў раней: «Я доўга ўпарта змагаўся супроць прасьледаваўшай мяне ідэі і хацеў пакончыць з сабою, але навязчывая ідэя аўладала мною настолькі, што я стаў ня рабом. **Я забіў Думэра, каб прымусіць Лігу нацый і ўсе вялікія дзяржавы—Францыю і Амэрыку змагацца супроць рускага камунізму. Француская прэфэктура вяла ў адносінах да мяне падвойную гульню.** Я спадзяваўся жыць ва Францыі, а потым выехаць у Швэйцарыю, але мне адмовілі ў пашпарце, не дазволілі займацца мэдыцынскай практыкай і выслалі мяне.

Парыская паліцыя і ген штаб добра ведалі аб пляне забойцы

ПАРЫЖ, 31. Адносна ўчарайшых паказаньняў белагвардзейца казака Лазарава **«Юманітэ»** піша: «Паліцыя і француская юстыцыя, ня гледзячы на правалы адзін за другім усіх антысавецкіх махінацый, ня трацяць надзеі выдаць белагвардзейца Гаргулава за бальшавіка. Лазараў, які не пазнаў у Тарбэ па здымках Гаргулава, сёньня, згодна новай паліцэйскай інструкцыі скардзіцца, што яго дрэнна зразумелі. «Юманітэ», падкрэсьліваючы ўчарайшую заяву Гаргулава, што ён забіў Думэра, каб прымусіць дзяржавы змагацца супроць СССР, піша: «Такім чынам, ня гледзячы на ўсіх знойдзеных паліцыяй казакаў забойца Думэра прызнаў, што ён зьяўляецца рускім фашыстам, які хацеў стрэлам з рэвальвэру выклікаць вайну супроць саветаў».

«Юманітэ», падаючы артыкул бэрлінскага белагвардзейскага «Руля» ад красавіка 1930 году зазначае, што гэты артыкул даказвае, што **ўжо ў 1930 годзе белагвардзейцы ў Бэрліне добра ведалі Гаргулава і дапамагалі яму таксама, як і парыскія белагвардзейцы з «Возрождения», якія апублікавалі праграму Гаргулава.** «Француская паліцыя праз Кручкова, піша **«Юманітэ»**, і генэральны штаб праз Мілера аднолькава ведалі мэту і намеры забойцы Думэра — рускага фашыста.

Больш цьвёрда, чым калі-б там ні было мы гаворым, што **«Гаргулаў выканаў свой правакацыйны акт супольна з прыскімі белагвардзейцамі і пад іх кіраўніцтвам, з мэтай выклікаць антысавецкую вайну.** Больш рашуча, чым калі-б там ні было, мы разам з усім францускім пралетарыятам патрабуем выгнаньня з Францыі белагвардзейцаў і адстаўкі кіраўнікоў францускай паліцыі».

Гаргулаў псыхічна зусім здароў

Заключэньне экспэртаў-псыхіятраў

ПАРЫЖ, 1/VI. (ТАСС). Экспэрты-псыхіятры, якія праводзілі агляд Гаргулава, прадставілі судзьдзі сьледчаму Фужэры заключэньне на 80 старонках. Экспэрты прыходзяць аднагалосна да паступнага выводу: 1) **Злачынства ня зроблена ў стане вар'яцтва,** прадугледжанага 64 арт. Крымінальнага Кодэксу, 2) **у Гаргулава не заўважаецца ніякіх адхіленьняў і анамалій псыхічнага характару,** якія абмяжоўваюць меры крымінальнай адказнасьці, 3) Гаргулава належыць разглядаць як суб'екта, поўнасьцю адказнага за зробленае. Дасьледваньне крыві не дало паказаньняў на сыфілітычнае захворваньне Гаргулава. У судовых колах мяркуюць, што абаронца Жэроф патрабуе новага агляду Гаргулава экспэртамі па выбары абаронцы.

БАРЫКАДЫ НА ВУЛІЦАХ ЭЛЬБЭРФЭЛЬДА

Бурныя выступленьні бес працоўных ў Вупэртале

БЭРЛІН, 31. Бурныя выступленьні галадаючых беспрацоўных у раёне **Вупэртале** (Заходняя Германія) працягваюцца. Трэцяга дня ў **Эльбэрфэльдзе** адбыліся новыя дэманстрацыі і сутычкі з паліцыяй. **Беспрацоўныя, абараняючыся ад паліцыі, пабудавалі барыкады.** У Эльбэрфэльдзе фактычна ўстаноўлена асадное становішча. Адбываюцца павальныя вобыскі дамоў і праходжых. Учора **ў Гамбургу галодныя натоўпы з беспрацоўных у арганізаваным парадку канфіскавалі тавары ў крамах, спынялі на вуліцах грузавікі з мясам, разьмяркоўваючы мяса сярод беспрацоўных.** Апалёгічныя факты мелі месца таксама ўчора.

Пахаваньне забітага рабочага ператварылася ў магутную дэманстрацыю пратэсту

БЭРЛІН, 31/V. (ТАСС). Пахаваньне расстраляннага паліцэйскімі пры дэманстрацыі беспрацоўных у Гамбургу рабочага Вебэра, ператварылася ў вялікую дэманстрацыю супроць фашысцкага тэрору. Трупу забітага праводзіў шматтысячны натоўп рабочых працуючых і беспрацоўных. Паліцэйскія аказаліся ня ў стане справіцца з людзкім патокам. Паліцыя адкрыла страляніну па натоўпе. Абуранымі беспрацоўнымі выбіты шыбы аптовага магазыну і разьбіты чатыры прыгожыя аўтамабілі, якія дэманстрацыйна ўехалі ў натоўп. Пры сутычцы забіт паліцэйскі.

ЯШЧЭ АДНА АХВЯРА ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ

Замучан сакратар кампартыі Індакітаю

ПАРЫЖ, 27/V. (ТАСС). **«Юманітэ»** паведамляе, што генэральны сакратар камуністычнай партыі Індакітаю **тав. Ліквей памёр у цэнтральнай Сайгонскай турме, дзе ён утрымліваўся з іншымі палітзьняволенымі ў нязвычайна цяжкіх умовах.** Тав. Ліквей, — піша «Юманітэ», — нарадзіўся ў 1902 годзе ў беднай сям'і. У 1922 годзе, яшчэ будучы студэнтам каледжу Хуэ, пачаў прымаць актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху ў правінцыі Вінх. У 1924 годзе ён разам з іншымі 5 таварышамі быў адным з заснавальнікаў рэвалюцыйнай партыі «Новы Анам». Працуючы ў Кантоне над злучэньнем гэтай партыі з арганізацыяй Анамісцкай рэвалюцыйнай моладзі, ён сутыкнуўся з камуністычнымі коламі, успрыняў ідэям ленінскае вучэньне і стаў адным з адданейшых байцоў Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Улада прыгаварыла яго завочна да пакараньня сьмерцю. Пад яго кіраўніцтвам кампартыя Індакітаю пачала стапавацца сапраўды масавай і баявой рэвалюцыйнай партыяй. Тав. Ліквей разам з 10.000 іншых палітзьняволеных рэвалюцыянэраў Індакітаю быў таксама кінут францускімі імпэрыялістамі ў турму. **Каты над ім здзекаваліся, катавалі яго і замучылі.**

Працэс сакратара Ціхаакіянскага сакратарыяту прафсаюзаў

БЭЙПІН, 31/V. (ТАСС). Згодна паведамленьняў кітайскай прэсы, у бліжэйшыя дні адбудзецца **працэс Руэга, сакратара Ціхаакіянскага сакратарыяту прафсаюзаў,** арыштаванага разам з жонкай яшчэ ў сярэдзіне ліпеня 1931 г. чужаземнай паліцыяй у Шанхаі (у чужаземным сэтльмэнце) і выдаднага кітайскім уладам. Руэг абвінавачваецца нанкінскім урадам у тым, што ён зьяўляецца «далёка-ўсходнім прадстаўніком Прафінтэрну». Усе мэтады гаміданаўскага «правасудзьдзя» пушчаны ў ход, каб даказаць вінаватасьць Руэга і яго жонкі. Выкарыстоўваюцца «дакуманты», выпушчаныя кітайскай ахранкай і контр-разьведкай чужаземных імпэрыялістаў. «Расьсьледваньне» справы цягнецца ўжо каля году. Зьяволеныя пазбаўлены самых элемэнтарных правоў. Чужаземным адвакатам не дазваляюць абараняць Руэга па працэсе на той падставе, што ён не зарэгістрован у Нанкіне. Нанкінскі ўрад прабуе любой цаной даказаць, што Руэгі імкнуліся стварыць пагрозу для рэспублікі і «парушыць сучасную палітычную сыстэму ў Кітаі».

Нанкінскі ўрад штодзенна атрымлівае шмат тэлеграм з пратэстамі супроць расправы над Руэгамі. Рад буйнейшых вучоных сьвету зьвярнуліся да Нанкіну з патрабаваньнем вызваленьня Руэга. Міжнародны камітэт абароны Руэгаў, у які ўваходзіць **Рамэн Ралян, Барбюс і інш. дзеячы мастацтва і навукі, зьвярнуўся да грамадзкіх колаў з заклікам умяшацца ў справу Руэга. Сун Цзін-лін** (удава Сун Ят-сэна) апублікавала заяву, у якой ганьбіць дзеяньні гаміданаўскіх катаў і патрабуе неадкладнага вызваленьня зьняволеных.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Зацьверджана Калегіяй НКЗ СССР ад 27-IV-1932 г. (прат. №26)

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ У СЬВІНАГАДОЎЧЫХ ТАВАРНЫХ КАЛГАСНЫХ ФЭРМАХ*)

III. Зьдзельшчына

У мэтах стварэньня матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьнікаў і спэцыялістаў, працуючых на сьвінафэрме, у справе бязумоўнага выкананьня і перавыкананьня пляну здачы (продажу) таварнай прадукцыі, гадоўлі і фармаваньня стада, а таксама ўстанаўленьня ацэнкі працы ў залежнасьці ад яе вынікаў,—усе работы на фэрме арганізуюцца на аснове брыгаднай зьдзельшчыны.

Для правільнага правядзеньня зьдзельшчыны праца сьвінаводаў, у тым ліку і працуючых на ізапятарах па непасрэдным абслугоўваньні пагалоўя сьвінафэрм, адносіцца да 4-й групы цяжкіх і патрабуючых спэцыяльнага вопыту работ з ацэнкай гэтай групы ў 1,25 працадня.

Выходзячы з устаноўленай у калгасах ацэнкі гэтай групы работ налічэньне працадзён праводзіцца ў кожнай брыгадзе ў паасобку, прычым праца стар. сьвінавода (брыгадзіра) ацэньваецца на 50 проц. вышэй чым радавога сьвінавода яго брыгады.

Прыкладная зьдзельная ацэнка работы ў працадніёх брыгады

НАЗВА ПАКАЗАЛЬНІКАЎ	Нормы выпрацоўкі брыгады, выходзячы з 6,5 дзелавых парасят 8-мі месяч. узросту ад маткі ў год	Ацэнка адзінкі прадукцыі ў працаднёх для брыгады ў цэлым	Гадавая выпрацоўка брыгады пры выкананьні вытворчага заданьня
1. За кожнае жывое пры апаросе зарэгістраванае парасё ў дзень нараджэньня	135 парасят	1,75	236
2. За кожнае аднятае 2-месячнае парасё . . .	„	2,40	324
3. За кожнае даведзенае да 4-х мес. узросту парасё	„	1,75	236
4. За кожны цэнтнэр прадукцыі ў жывой вазе ад 135×70—94,5 . . .	94,5 цэнтн.	8,50	804
Разам . . .			1600

Выходзячы з гэтага, пры выкананьні брыгадай вытворчага заданьня кожнаму з працуючых у брыгадзе радавому сьвінаводу і брыгадзіру будзе налічана працадзён:

НАЗВА ПАКАЗАЛЬНІКАЎ	Нормы выпрацоўкі брыгады, выходзячы з 6,5 дзел. парасят 8 мес. узр. ад маткі ў год	Будзе налічана за адзінку прадукцыі ў працаднёх: Кожнаму радавому сьвінаводу	Старш. сьвінаводу (брыгадзіру)	Гадавая выпрацоўка ў працаднёх пры выкананьні вытворчага заданьня: Радавому сьвінаводу	Ст. сьвінаводу (брыгадзіру)	Брыгадзе ў цэлым
1. За кожнае жывое пры апаросе зарэгістраванае парасё ў дзень нараджэньня	135 парас.	0,50	0,75	68	100	236
2. За кожнае аднятае 2-месячнае парасё	135 „	0,70	1,00	95	135	325
3. За кожнае даведзенае да 4-х мес. узросту парасё . .	135 „	0,50	0,75	68	100	236
4. За кожны цэнтнэр прадукцыі ў жывой вазе ад 135×70—94,5	94,5 цэнт.	2,50	3,50	237	330	804
Разам . .				468	665	1600

Гэта прыкладная зьдзельная ацэнка працы ў працаднёх адносіцца да таварных фэрм, а прыстасаваньне яе ў племфэрмах павінна праводзіцца з улікам асаблівасьцяй іх вытворчасьці.

Запіс працадзён праводзіцца кожны раз пры нараджэньні парасят пасьля рэгістрацыі іх у дзень нараджэньня, пры дасягненьні імі 2-месячнага і 4-месячнага ўзросту і пры кожнай здачы (продажу) таварнай прадукцыі ці пераводзе ў матачнае (вытворчае) стада.

«Ацэнка працадзён калгасьніка павышаецца ці паніжаецца ў залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага 1932 г.).

За перавыкананьне ўстаноўленага вытворчага заданьня робіцца налічэньне працадзён брыгадзе ў падвойным разьмеры за кожнае парасё ў 4-месячным узросьце, атрыманае звыш устаноўленай колькасьці, кожнаму радавому сьвінаводу—па 1-му працадню і стар. сьвінаводу— 1,5 працадня; за кожны цэнтнэр прадукцыі жывой вагі, атрыманай звыш пляну радавым сьвінаводам—па 5 працадзён, а старшаму сьвінаводу—7 працадзён.

За кожнае паўшае парасё з народжаных і ў дзень нараджэньня зарэгістраваных утрымліваецца з радавых сьвінаводаў у падвойным разьмеры супроць налічэньня за захаваньне парасят, а са старшага сьвінавода (брыгадзіра) ў падвойным разьмеры супроць утрыманьня з радавога, г. зн. за падзёж парасят да 2-месячнага ўзросту з кожнага радавога сьвінавода ўтрымліваецца па 1-му працадню, а са старшага сьвінавода—2 працадні; за падзёж парасят ва ўзросьце ад 2-х да 4-х месяцаў з радавых сьвінаводаў утрымліваецца па 2,4 працадня, а са старшага сьвінавода — 4,8 працадня, за падзёж парасят ва ўзросьце старэй 4-х месяцаў з радавых сьвінаводаў утрымліваецца па 3,4 працадня, а са старшага сьвінавода—6,8 працадня.

РАБОТА КАЛГАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ ЎВАХОДЗЯЦЬ У СКЛАД АБСЛУГОЎВАЮЧАЙ БРЫГАДЫ (ПАДВОЗКА КОРМУ, ВАДЫ І Г. Д.) АДНОСІЦЦА ДА 3-ЯЙ ГРУПЫ ЦЯЖКІХ РАБОТ З АЦЭНКАЙ ГЭТАЙ ГРУПЫ Ў АДЗІН ПРАЦАДЗЕНЬ. БРЫГАДЗІР ГЭТАЙ БРЫГАДЫ АТРЫМЛІВАЕ СЯРЭДНЮЮ ВЫПРАЦОЎКУ РАДАВЫХ СЬВІНАВОДАЎ ФЭРМЫ.

Ва ўсіх сьвінафэрмах, маючых больш 21 сьвіноматкі, выпучаецца загадчык фэрмай, аслабанёны ад іншых работ, які таксама, як тэхнік сьвінавод і вэттэхнік (калі яны члены данага калгасу) атрымлівае працадні ў 2 разы больш сярэдняй выпрацоўкі радавых сьвінаводаў усёй фэрмы, а вучотчык фэрмы атрымлівае нароўні з старшым сьвінаводам (брыгадзірам).

УВАГА: На фэрмах, маючых пагалоўе да 21 сьвіноматкі старшы сьвінавод (брыгадзір) адначасова зьяўляецца і загадчыкам фэрмы.

У мэтах павышэньня зацікаўленасьці сьвінаводаў у захаваньні і гадоўлі маладняка і поўнага выкананьня пляну здачы (продажу) таварнай прадукцыі, брыгадзе ўстанаўліваецца грашовая даплата звыш налічаемых працадзён у разьмерах: па 1 р. за кожнае выгадаванае да 2-мес. узросту парасё і па 1 руб. за кожны цэнтнэр здачай (праданай) таварнай прадукцыі дзяржаве.

Выдача гэтай грашовай даплаты павінна праводзіцца праўленьнем калгасу зараз-жа па дасягненьні маладняком 2-месячнага ўзросту і пры кожнай здачы (продажу) таварнай прадукцыі.

Па кожнай брыгадзе ў паасобку ўста наўліваецца абавязковa вытворчы ўлік, згодна форм дакладнай і месячнай справаздачнасьці, зацьверджанай Сьвінаводкалгасцэнтрам. Для вядзеньня гэтай справаздачнасьці на фэрмах пры наяўнасьці 2-х і больш брыгад выпучаецца вучотчык, аслабанёны ад іншых работ. У тых фэрмах, у якіх ёсьць толькі адна брыгада, работу па ўліку выконвае загадчык фэрмы.

На кожнай сьвінагадоўчай фэрме абавязкова павінна быць арганізавана вытворчая нарада, на якую запрашаюцца калгасьнікі і спэцыялісты, працуючыя на фэрме. Кіраўніцтва і адказнасьць за работу вытворчых нарад ускладаецца непасрэдна на загадчыка фэрмы.

Для заахвочваньня лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, якія сыстэматычна перавыконваюць вытворчае заданьне, захоўваюць эканомію ў расходваньні кармоў і беражліва адносяцца да маемасьці і жывёлы фэрмы, у кожнай сьвінагадоўчай фэрме арганізуюцца спэцыяльныя грашовыя фонды для прэміраваньня ў разьмерах ня менш 3 проц. вапавога даходу фэрмы, што адлічваецца праўленьнем калгасу па дагаворы з Сьвінаводкалгасцэнтрам. Прэміі павінны выдавацца неадкладна пасьля выяўленьня вынікаў работы.

У сувязі з увядзеньнем гэтага палажэньня аб арганізацыі працы на сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрмах Сьвінаводкалгассаюз БССР прапануе ўсім загадчыкам фэрмамі, раённым упаўнаважаным і загадчыкам канторамі Сьвінаводкалгассаюзу забясьпечыць у найхутчэйшы тэрмін сапраўднае правядзеньне ў жыцьцё арганізацыі працы, згодна гэтага палажэньня.

*) Канец. Пачатак гл. у № 121 ад 31/V-32 г.

НА ПОДСТУПАХ ДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Распрацоўка праблем другога пяцігадовага пляну БССР

Дзяржплян БССР праводзіць зараз шырокую падрыхтоўку да складаньня пляну другой пяцігодкі. Праведзены нарады з наркоматамі па пытаньні намячэньня разьвіцьця паасобных галін народнай гаспадаркі.

Глыбока прапрацоўваюцца важнейшыя комплексныя праблемы. Складзены ўжо намячэньні аплавага балянсу, які цалкам пабудован на ўжываньні торфу; скончана распрацоўка балянсу будматар'ялаў, паводле якога ўдзельная вага новых матар'ялаў павінна ўзрасьці да 50 проц.

Заканчваецца балянс выпрацоўкі і спажываньня электраэнэргіі ў другой пяцігодцы, які грунтуецца на выпрацоўцы да 1937 г. 2½ мпрд. кілёват-гадзін. Складаецца балянс абсталяваньня, які павінен даць малюнак агульнай патрэбы ўсіх галін народнай гаспадаркі ў абсталяваньні. На аснове гэтага балянсу будуць даны заяўкі мэталяапрацоўчай прамысловасьці БССР і машына-будаўнічай прамысловасьці Саюзу аб выраба адпаведнага асартымэнту абсталяваньня.

Распрацоўваецца балянс асноўных відаў сырцу як мясцовага, так і прывознага. Складаецца таксама паасобныя сельска-гаспадарчыя балянсы—кармовы і збожжа-фуражны.

Канфэрэнцыі і зьезды па пытаньнях другой пяцігодкі

Дзяржплян у чэрвені і ліпені праводзіць рад зьездаў, канфэрэнцый і нарад па пытаньні пяцігадовых пляноў паасобных галін народнай гаспадаркі.

У чэрвені будуць праведзены: энэргазьезд, нарада па прыродных і сырцовых рэсурсах, па транспарце, па будіндустрыі і будматар'ялах, канфэрэнцыя па сельскай гаспадарцы і пераапрацоўцы с.-г. прадукцыі. У ліпені будуць праведзены нарады па пытаньнях хэмізацыі народнай гаспадаркі, дрэваапрацоўчай прамысловасьці і лясной гаспадаркі, па працы і кадрах, па камунальна-жыльлёвай гаспадарцы і інш.

Папраўка

У прамове тав. П. Горына на IV усебеларускім зьезьдзе ІТС, зьмешчанай у «Зьвязьдзе» № 108 за 15 мая, у самым апошнім абзацы, 12 радку зьнізу замест **«з найменшымі адхіленьнямі» трэба чытаць «з малейшымі адхіленьнямі».**

3-га чэрвеня, а 7 гадз. увечары, У ПАМЯШКАНЬНІ РЭДАКЦЫІ ГАЗ. «ЗЬВЯЗДА» (Савецкая, 63, 3-ці паверх) АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭНЬНЕ

КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ КАМУНАЛЬНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

На парадку дня інфармацыя загадчыка менскага аддзяленьня Белбудканторы тав. ЕВЕЛЕЎСКАГА і кіраўніка Менбуду тав. АНДРЭЕВА аб жыльлёвым будаўніцтве (пад кутом выкананьня пастановы сакратарыяту гаркому КП(б)Б ад 23 мая) і інфармацыя кіраўніка Белкамунбанку тав. РОЗЭНГАУЗА аб выніках абсьледваньня ходу жыльлёвага будаўніцтва.

Апрача членаў камісіі т. т. Шлэктарава, Мееровіча, Валодзькі, Крылова, Кеніга, Даніловіча, Шулькіна, Юдзіна, Левіна (Белжылсаюз), Модліна, Фіша, Абрамсона, Кавалёва (ЦСПСБ), Пятровіча, Лунгіна, Кагана, Дыбоўскага, Этле, Аксючыца, Розэнгауза — запрашаюцца прадстаўнікі ЖБКТ «Камінтэрн», імя 1-га мая і «Чырвоны чыгуначнік», фабрыкі «Кастрычнік», аб'яднаньне будматар'ялаў, заводаў «Камунар» і імя Варашылава, Менхарчтрэсту, камунальна-будаўнічай сэкцыі гарсавету, Будсэкцыі ЦКК-РСІ і ўсе жадаючыя.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— ЦКК-НК РСІ БССР сёньня, у 7 г. веч., у памяшканьні НК РСІ Беларусі (Савецкая, 55, пакой № 12) склікае нараду па пытаньні аб разгрузцы Менскага вузла ад нявывезеных грузаў. На нараду выклікаюцца прадстаўнікі наступных арганізацый: Саюзтранс, Гарсавет — тав. Млодзік, нам. нач. станцыі Менск па камэрцыйнай частцы, прадстаўнікі рэд. газ. «Зьвязда» і «Рабочай», прадстаўнікі Менбудаўніцтва, Белкаапсаюзу, швэйнай ф-кі «Кастрычнік», канд. ф-кі «Камунарка», абутк. ф-кі, зав. «Бальшавік», патачнага заводу «Ч. З.», дражджавога заводу «Пралетары», зав. «Беларусь», гутны «Пралетары», Сьпіртзаводу, зав. «Камунар», мылавар. зав. БКС, НК Кам. гасп., Электрастанцыі, Электрацэнтралі, Белдзяржбуду, Белбулсувязі, Белгандлю, Белкамбуду, Менрайсаюзу, Хлебазаводу, Белмясатрэсту, Белпушкасаюзу, УНР-41. Яўка ўсіх абавязкова.

— Сёньня, роўна ў 2 гадз. дня, у памяшканьні Менгаркому КП(б)Б (2-гі паверх, пакой № 24) адбудзецца пасяджэньне агульна-гарадзкога штабу па правядзеньні летняй аздаравіцельнай кампаніі сярод дзяцей. На пасяджэньне штабу павінны зьявіцца прадстаўнікі ад наступных арганізацый: Гарсавету, Гарпрафсавету, Гарсавету фізкультуры, таварыства «Прыхільнік дзяцей», Гарздраву, т-ва Чырвонага Крыжу, дзіцячага дыспансэру, Гарсацстраху і заводу імя Варашылава, «Камунар» і «Кастрычнік». Яўка без спазьненьня.

— Менгарком КП(б)Б склікае 5-га чэрвеня, у 6 гадз. веч., у памяшканьні Дому Камасьветы **1-Ю МЕНСКУЮ ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ ПАРТОРГАЎ.** Сакратаром парткалектываў і ячэек (вытворчых, транспартных і будаўнічых) прапануецца зьявіцца ў Гарком 3-га, 4-га і 5-га чэрвеня з 10 да 4 гадз. дня ў пакой № 4 за атрыманьнем мандатаў і білетаў.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

10-VI г. г. у г. Менску склікаецца

1-ы УСЕБЕЛАРУСКІ ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ЗЬЕЗД

У парадку работ зьезду стаяць пытаньні:

1. Перспэктывы разьвіцьця нар. гаспадаркі БССР.
2. Генплян і 2-я пяцігодка электрыфікацыі і БССР.
3. Энэрга-рэсурсы БССР 2-й пяцігодкі торфу, паліўны балянс.
4. Пытаньні цеплафікацыі і газафікацыі гарадоў.
5. Шляхі тэхнічнай рэканструкцыі на грунце электрыфікацыі прамыслов., с-гаспадаркі, камунальнай гаспадаркі, энэргагаспадаркі, гаспадаркі слабых токаў (радыё, тэлефон, телеграф у 1-й і 2-й 5-годкі).
6. Пытаньні масавай работы:
Аб рабоце энэрга-ячэек на прадпрыемствах, шэфства ЛКСМБ над электрыфікацыяй, барацьба за эканомію паліва і інш.
7. Сыстэма навукова-дасьледчых арганізацый у галіне энэргетыкі.
8. Кадры энэргетыкаў і сыстэма іх падрыхтоўкі.
9. Рад спэцыяльна-тэхнічных пытаньняў энэрга-гаспадаркі, энэрга і цепла спажываньня асобных галін народнай гаспадаркі.
10. Рад дакладаў вядомых вучоных і спэцыялістаў СССР і БССР аб навукова-тэхнічных прадпасылках і задачах пляну электрыфікацыі.
11. Выбары Беларускага Энэргетычнага Камітэту.

Зьезд будзе праходзіць пры шырокім удзеле прадстаўнікоў ад рабочых, партыйных, савецкіх і інж.-тэхнічных арганізацый, энэрга-ячэек, камсамолу і навукова-дасьледчых устаноў БССР і СССР.

Нормы прадстаўніцтва разасланы Дзяржплянам непасрэдна месцам.

Запрошаны прадстаўнікі ад Ленінградзкай і Заходняй вобласьцей і УССР, а таксама рад вядомых вучоных СССР.

Старшыня арг. кам. па склік. энэргазьезду
Старшыня Дзяржпляну БССР **ШАЛІРА.**
Адк. сакратар аргкамітэту **ЧУДНОЎСКІ.**

Інстытут завочнай тэхнічнай адукацыі „ВСНИТО"

КАМБІНАТЫ: РЫХТУЮЦЬ ІНЖЫНЭРАЎ, ТЭХНІКАЎ І ЧАРЦЁЖНІКАЎ БУДАЎНІЧАЙ І МЭХАНІЧНАЙ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦЯЙ.

КУРСЫ: 1) Павышэньня кваліфікацыі інжынэрн. і тэхн. будаўн. мэханічн. спэцыяльнасьцей. 2) Рабочай падрыхтоўкі ў ВТНУ і тэхнікум. 3) Грамадзка-палітычн. дысцыпліны для ІТР.

Прыём заяў круглы год. Праспакты, анкеты, кантрольныя работы высылаюцца па запатрабаваньні па 20 коп. за экз. маркамі.
МОСКВА, ИЛЬИНКА, ПРОЕЗД им. ВЛАДИМИРОВА, 6.
ДЫРЭКЦЫЯ „ИЗТО"

ЗАНЯТКІ
ВЕСНАВОГА НАБОРУ ў КАМВУЗЕ БЕЛАРУСІ імя Леніна
пачынаюцца 10 чэрвеня 1932 г.

Чырв. Зорка — Пач. 6, 7-30, 9, 10-30, Каса—ад 4 г. — ЗДАРЭНЬНІ ў гор. СЭН-ЛУІ. Драма ў 7 частках. Зьвыш праг. Кіно-хроніка
Інтэрнацыянал — Амэрыканскі мастацкі фільм МАУЧАЦЬ (Бязбожніца). Зьвыш праг. Кіно-хроніка
Пралетары — ЗДРАДНІК. Кіно-раман ў 8 частках
Спартак — Пач. 7-15, 9, 10-45, Каса—ад 5